УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Паскярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адгку.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

Тэлефоны:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адзвел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

АЎТОРАК, 25 лютага 1930 г.
№ 47 (3555)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Пазыка пераможнага сацыялістычнага наступленьня

Будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі ўступіла ў рашаючую паласу. Вялізная тэхнічная рэканструкцыя прамысловасьці, пячуваны тэмп калектывізацыі сельскае гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі, выражаюць сабою новы этап сацыялістычнага будаўніцтва.

Жорсткім супраціўленьнем сустракаюць ворагі пралетарскае дыктатуры ўнутры і за межамі пераможнае наступленьне рабочае клясы.

Перад нарастаючай небясьпекай нападу на СССР, перад шалёным супраціўленьнем кулацтва, у гушчы шырокіх мас нарадзіўся баявы лёзунг — паскорыць тэмп разгортваньня сацыялістычнага наступленьня, **выканаць пяцігодку ў чатыры гады.**

Выкананьне гэтае задачы патрабуе напружанай і настойлівай мабілізацыі ўсіх сродкаў, вялізарнейшых капітальных складаньняў у прамысловасьць і сельскую гаспадарку. Пры немагчымасьці карыстаньня замежным доўгатэрміновым крэдытам, унутраныя пазыкі зьяўляюцца адным з магутных сродкаў ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну вялікіх работ.

Савецкай дзяржаве павінны даць крэдыт самі працоўныя. Гэта добра ўсьвядомілі шырокія масы рабочых, служачых і бядняцка-сераднякоае сялянства. Падпіска на пазыкі індустрыялізацыі праходзіла ў нас з вялікім уздымам і далёка перавысіла намечаныя разьмеры. 3-я пазыка індустрыялізацыі на БССР дала звыш 17 млн. руб., пры чым прапоўныя патрабаваньні ад ураду павялічыць суму выпушчанай пазыкі. Рабочая кляса дала звыш 75 проц. сабраных сум.

У апошнім часе па прадпрыемствах раду гарадоў СССР, у тым ліку і ў нас, у БССР, пракацілася хваля патрабаваньняў да ўраду аб выпуску новае пазыкі, якая-б дала новыя мільёны на выкананьне баявога лёзунгу рабочае клясы «пяцігодку — у чатыры гады» і гарантавала-б доўгатэрміновы крэдыт дзяржаве.

Рабочыя ўжо неаднакрацьі выказалі незадаваленьне існуючай тэхнікай выпуску пазык, якая не забясьпечвае магчымасьці сачыць за выйгрышамі, якая значна ўдаражае дзяржаўны крэдыт.

Выпусьціць **адзіную** пазыку, якая аб'яднала-б як раней выпушчаныя пазыкі, так і новыя паступленьні — такое патрабаваньне высунулі рабочыя СССР перад сваім урадам.

Дэкрэт Саюзнага ўраду аб выпуску новай пазыкі і аб умовах яе рэалізацыі ідзе насустрач запатрабаваньням рабочых мас, увасабляе імкненьне рабочых мас паскорыць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Дэкрэт дае новай пазыцы назву самага папулярнага сярод рабочае клясы лёзунгу **«Пяцігодку—у чатыры гады».**

Адначасова, дэкрэт ідзе насустрач задаваленьню шматлікіх пастаноў рабочых сходаў аб неабходнасьці захаваньня набытых аблігацый, аб гарантаваньні доўгатэрміновага крэдыту.

У далейшым продаж і заклад аблігацый можа праводзіцца толькі з дазволу камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту, пад кантролем савецкай грамадзкасьці, бо пазыкі могуць адыграць сваю вялізную ролю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва **толькі ў тым выпадку, калі яны носяць доўгатэрміновы характар.**

Устанаўленьне грамадзкага кантролю над распараджэньнем аблігацыямі пазык дае кожнаму рабочаму калектыву ўпэўненасьць, што крэдыт пяцігодцы ня будзе сарваны асобнымі несьвядомымі членамі калектыву.

Задача ўсяе савецкае грамадзкасьці, усіх партыйных, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый — усямерна ўзмацніць камісіі садзейнічаньня, на якія, паводле пастановы ўраду, прыпадае адказная задача грамадзкага кантролю над пазыкамі, дабіцца, каб самыя адсталыя рабочыя усьвядомілі вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне пазык.

Чым больш крэдыту атрымае дзяржава, тым хутчэй мы выкарчуем карэньні капіталізму, тым хутчэй мы пабудуем сацыялізм.

ЛІДЭР НЯМЕЦКІХ ПРЫМІРЭНЦАЎ ЭВЭРТ ПРЫЗНАЎ СВАЕ ПАМЫЛКІ

Поўны развал трацкісцкага „ленінбунду“ ў Нямеччыне

БЭРЛІН, 23. Лідэр прымірэнцаў унутры Нямецкай кампартыі Эвэрт зьвярнуўся да ЦК КП Нямеччыны з заявай, у якой прызнае няправільнасьць сваіх антыпартыйных поглядаў, каторыя ён абараняў да Вэдынскага зьезду партыі. Эвэрт прызнае няправільнасьць сваёй ацэнкі міжнароднага становішча, памылковасьць сваёй пазыцыі ў прафсаюзным пытаньні, а таксама ў пытаньні аб перавыбарах фабрычна-заводзкіх камітэтаў і аб сацыял-фашызьме. Эвэрт абавязуецца актыўна праводзіць ў жыцьцё пастановы партыі па ўсіх пытаньнях, прызнае недапушчальнасьць арганізацыі якіх-бы ні было фракцый і груп, заяўляе аб сваёй поўнай згодзе з генэральнай лініяй і тактыкай УсеКП(б), адхіляе погляды, якія абараняў Бухарын, абавязуецца эміграцыя пад кіраўніцтвам ЦК КП Нямеччыны супроць апартуністычных поглядаў унутры партыі, супроць правых ворагаў партыі, брандлераўскай арганізацыі, а таксама супроць усякіх прымірэнчых да іх адносін. Эвэрт зазначае, што прызнаньне ім усіх пастаноў партыі адносіцца і да пастановы Камінтэрну ў сувязі са справаю Вітарфа (былога сакратара Прыморскай арганізацыі Нямецкай кампартыі, растрату якога правыя элементы КП Нямеччыны прабавалі выкарыстаць для барацьбы з Тэльманам).

Такую-ж заяву падаў гэтым днямі ў ЦК КП Нямеччыны выключаны з партыі прымірэнец Стэфан.

Адначасова стала вядома пра новы раскол унутры трацкісцкага «ленінбунду». Большасьць, пад кіраўніцтвам Урбанса, якая адмоўна адносіцца да Троцкага, выключыла меншасьць, якая салідарызавалася з Троцкім. Такім чынам, трацкісцкая група Нямеччыны канчаткова расстала.

ЛІДЭР ПРЫМІРЭНЦАЎ ПРЫЗНАЎ БАНКРУЦТВА ПРЫМІРЭН�ЦТВА

БЭРЛІН, 23. «Ротэ Фанэ» ў сувязі з заявай Эвэрта падагульвае вынікі антыпартыйнай фракцыйнай дзейнасьці прымірэнцаў. Пасьля Вэдынскага зьезду партыі прымірэнцы праводзілі замаскаваную барацьбу супроць партыі, разьмеркаваўшы паміж сабою ролі. Кіруючая група прымірэнцаў ухілялася ад якіх-небудзь заяў па галоўных палітычных пытаньнях, затое яна высоўвала пізавых функцыянэраў на барацьбу супроць лініі партыі.

У Гамбургу прымірэнцы, якія маўчалі на працягу доўгіх месяцаў, зноў пачалі наступленьне супроць партыі, як толькі партыі давялося ў пачатку лютага распачаць сур'ёзныя баі. Тады з партыі было выключана некалькі выдатных прадстаўнікоў прымірэнцаў. Партыйныя масы патрабавалі, каб лідэры прымірэнцаў выразна растлумачылі свае пазыцыі. Пры такіх іменна ўмовах адыходзіць Эвэрт публічна ад свайго ранейшага погляду.

Партыя прымае да ведама, што цяпер сам лідэр прымірэнцаў прызнае банкрутства прымірэнцтва. Вядомая рэч, што партыя зусім ня можа прызнаць звычайную заяву дастатковай гарантыяй. Партыя павінна з недавер'ем адносіцца да звычайнай папяровай заявы таварыша, які зрабіў такія сур'ёзныя памылкі і гэтым прынёс партыі вялікую шкоду.

РЭВАЛЮЦЫІНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ НЯМЕЧЧЫНЫ ВІТАЕ ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ

БЭРЛІН, 23-II. У сувязі з 12-мі ўгодкамі Чырвонай арміі ЦК нямецкай кампартыі паслаў прывітальныя тэлеграмы падшэфнай дывізіі Чырвонай арміі, а таксама Варашылаву.

Рэдакцыя і рабкоры «Ротэ Фанэ» паслалі прывітаньне 20 Сальскаму кавалерыйскаму палку дывізіі Будзённага.

...ны саюз Чырвоных франтавікоў Чырвонай арміі на імя Ва... прывітальную тэлеграму.

***

..., 23-II. Канфэрэнцыя камуністаў гораду Гамбургу зьвярнулася ...палку Чырвонай арміі, над якім ... нямецкі пралетарыят, з тэлеграмай, у якой пасылае падшэфнаму ...ачае пралетарскае прывітаньне.

...ём аўганскага пасла т. Калініным

...А, 24-га лютага старшыня ...Р тав. Калінін прыняў новага ...а надзвычайнага і паўнамоцнага ...пана Мухамэд Асіз-хана, які ...яму свае вярыцельныя граматы ...я гэтага пасла меў прыватную ...ю ў тав. Калініна, якому ён ...асабісты ліст Надыр-хана.

...Аўганскі надзвычайны паўнамоцны пасол у Маскве Мухамэд Асіз-хан ...тарцы з супрацоўнікам ТАСС ...ае міжнародным і ўнутраным становішчы Аўганістану, а таксама аб яго ...аемаадносінах з Савецкім Саюзам заявіў наступнае:

«Палітыка зьбліжэньня і супрацоўніцтва з замежнымі дзяржавамі, зацікаўленымі ў захаваньні аўганскай незалежнасьці, адпавядае інтэрэсам самога Аўганістану, а таму будзе максымальна падтрымлівацца новым урадам. Гэтым тлумачыцца такое выразнае жаданьне падышаха Надыр-хана захаваць і яшчэ больш паглыбіць і пашырыць усе прыязцельскія адносіны, якія ўстаноўлены паміж Аўганістанам і Савецкім Саюзам.

Другая задача—гэта мерапрыемствы ў галіне аднаўленьня ...ванай гаспадаркі і ... краіны.

З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

БССР НЯ ВЫКАНАЛА ЗАДАНЬНЯ АБ ССЫПЦЫ НАСЕНЬНЯ Ў ТЭРМІН

На 20 лютага ссыпаня 86,3 проц. заданьня

Тэмп працы недастатковы.--У бліжэйшыя 4 дні нагнаць прапушчанае!

Поўная бязьдзейнасьць зямельных органаў у галіне арганізацыі рамонту

Апэрацыйная зводка з пасеўнага фронту

Гомельшчына ганебна адстала

Заданьне Саюзнага Наркамзему аб стварэньні насенных фондаў да 20-га лютага калгасамі БССР ня выканана.

Дагэтуль ссыпана ў абагуленыя фонды калгасаў звыш 108 тыс. тон насеньня. Гэта колькасьць здавальняе патрэбы калгасаў, арганізаваных да 10-га лютага толькі на 86,3 проц.

На першым месцы ідзе Віцебская округа (112 проц.), потым ідуць **Полацкая (96 проц.), Бабруйская (91 проц.) і Аршанская (90 проц.) акругі.**

Апошняе месца займае Гомельская округа **(63 проц.).**

Па тэхнічных культурах плян ссыпкі выкананы на 35 проц.

Плянавае заданьне па бульбе ў сярэднім выкананае на 60 проц. Таксама і па бульбе на першым месцы ідзе Мазырская округа (145 проц.), за ёю ідуць Менская округа (82 проц.) і Магілеўская (70 проц.).

Горш у акругах: Бабруйскай (36 проц.) і Аршанскай (38 проц.). Віцебская округа зусім не прадставіла вестак па бульбе.

Значна горш становішча з насеньнем траў, па якім сярэдні разьмер засыпкі дасягае ўсяго 25 проц.

Камітэты сялянскае ўзаемадапамогі выканалі плян ссыпкі насенных фондаў збожжавых культур на 42,6 проц. На першым месцы ідуць акругі: Бабруйская (82 проц.), Менская (65 проц.).

Тое, што засталося недавыкананым на 20-га лютага, павінна быць ва што-б там ні стала напоўнена на 1-га сакавіка, калі мы падагуляім канчатковыя вынікі работы кожнай акругі і кожнага раёну.

Трэба адзначыць, што лічбы аб ссыпцы насеньня ў калгасах выведзены ў адносінах разьмеру калектывізацыі на 10-га лютага.

Спыніць разбурэньне гаспадарчых будынкаў

У апошні час кулак павёў агітацыю сярод беднякоў і сераднякоў за разбурэньне сялянскіх гаспадарчых будынкаў і продаж іх на дровы ў мястэчках і бліжэйшых гарадох. Кулак распускае чуткі, што «ў калгасах дадуць каменныя будынкі, а таму руйнуйце свае будынкі, рэжце іх на дровы і вязеце на рынак прадаваць».

У Полацкай акрузе гэта шкодніцкая агітацыя пачынае ўжо даваць свае вынікі. Несьвядомыя сяляне і нават калгасьнікі разьбіраюць гумны, хлявы і лазьні, рэжуць іх на дровы і вязуць на рынак прадаваць.

Кірмашы мястэчак завалены дрывамі з старых будынкаў. Ніхто з гэтым зьявішчам не змагаецца.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

Да адказнасьці

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). АК КП(б)Б прызнаў работу па абагуленьні насеньня і ачыстцы на 20 лютага па акрузе **нездавальняючай,** а абагуленьне коняй і прадукцыйнае жывёлы **зусім нездавальняючым.**

За бязьдзейнасьць і невыкананьне дырэктыў бюро АК у тэрмін абвешчана **вымова бюро Быхаўскага райкому КП(б)Б і фракцыі РВК.**

За невыкананьне дырэктыў АК у тэрмін, **бюро райкому і фракцыям РВК Кармянскага, Прапойскага, Чэчэвіцкага і Лапалаўскага раёнаў пастаўлена на від.**

Фракцыі Паляводсаюзу за зусім слабую работу па кантрактацыі насеньня **абвешчана вымова.**

Усім райкомам КП(б)Б, фракцыям РВК прапанавана неадкладна узмацніць работу па абагуленьні насеньня, рабочай і прадукцыйнай жывёлы з тым каб плян быў выкананы ў тэрмін.

Гароднія саўгасы і калгасы без насеньня

Белсельтрэст павінен да веснавое сяўбы арганізаваць прыгарадныя агародныя саўгасы на плошчы звыш 1.100 гэкт. Да гэтага часу, аднак, ім ня прыняты належныя меры да забесьпячэньня гэтых саўгасаў насеньнем. За выключэньнем капусты, насеньня іншых агародных культур яшчэ няма. Пераважная частка віны за адсутнасьць насеньня прыпадае на самы трэст, бо заяўкі былі ім даны з вялікім спазьненьнем. Цікавы штрых: зараз высьветлілася, што патрабасьць блізкіх да Менску агародных саўгасаў у насеньні забылі ўлічыць.

Беларускі садова - агародны саюз мае заданьне да вясны арганізаваць 167 прыгарадных агародных калгасаў з плошчаю ў 28.000 гэкт. На 10-га лютага арганізавана ўжо звыш 100 калгасаў на плошчы каля 10.000 гэкт.

Калгасы забясьпечаны пакуль што насеньнем толькі на 50 проц. Не хапае насеньня цыбулі, морквы, гароху, часнаку і цукорыя.

Дрэнна ідзе падрыхтоўка з будаўніцтвам у БССР заводаў на апрацоўцы садавіны і гароднины, на якія асыгнавана каля 3 мільёнаў руб. Яшчэ не заключаны дагавары з будаўнічымі арганізацыямі, ня складзены праекты, не загатоўлен будаўнічы матар'ял.

НА ПАСЕЎНЫ ФРОНТ!

185 студэнтаў і 50 навуковых працаўнікоў абвясьцілі сябе мабілізаванымі

130 студэнтаў калфаку і аграфаку, 15 —мэфаку і 40—лесфаку 3-га курсу беларускай с.-г. акадэміі ў Горках абвясьцілі сябе мабілізаванымі на веснавую пасеўную кампанію. На працягу 5-ці дзён усе мабілізаваныя прайшлі праз спэцыяльныя курсы рахункаводзтва, складаньня вытворчых плянаў, машыназнаўства. Усе 185 студэнтаў разьехаліся па калгасах раёну.

За прыкладам студэнтаў пайшлі 23 навуковыя працаўнікі і 17 асьпірантаў.

Учынак студэнцтва заразіў і некаторых старых прафэсароў, якія блізка стаяць да савецкай грамадзкасьці. Гэтыя прафэсары выявілі жаданьне быць зараз накіраванымі ў буйнейшыя калгасы, дзе яны займуцца арганізацыяй надрыхтоўкі да веснавое сяўбы.

ЧАМУ МАЎЧЫЦЬ ПРАКУРОР?

Каробчанскі фасфарытны млын мае заданьні забясьпечыць фасфарытнай мукой раёны Аршанскай акругі і часткова Магілеўскую акругу. Млын ужо загатовіў вялікую колькасьць мукі. Але Мсьціслаўскі, Расьнянскі, Дрыбінскі і Горацкі раёны, якім ужо даўно запрапанавана забраць з млыну 25 вагонаў фасфарытнай мукі, усё яшчэ марудзяць з гэтай справай. Забрана толькі 6 вагонаў. Магілеўскі-ж акрпаляводсаюз зусім нічога ня робіць, каб адгрузіць 350 тон мукі, якія яму вызначаны.

У выніку такіх нядбайных адносін паляводчае сыстэмы стварыліся затрудненьні, якія перашкаджаюць Каробчанскаму млыну разгортваць сваю работу. Больш малоць фасфарытную муку амаль немагчыма, бо няма куды не дзець — увесь двор і ўсе склады ўжо завалены мукою.

Марудзасьць паляводчае сыстэмы ў справе вывазкі фасфарытнае мукі з млыну прывядзе да таго, што ў хуткім часе яны зусім ня змогуць забраць гэту муку з таго прычыны, што наступіць адліга.

Трэба адзначыць таксама «хладнокровность» аршанскага пракурора. Ня гледзячы на тое, што да яго зьвярнуліся з просьбай прыцягнуць вінаватых у неадгрузцы мукі да адказнасьці, ён да гэтага часу на гэта не рэагуе.

ДАНІЛОВІЧ.

Патрэбны рашучыя меры

Разбазарваньню кармоў (сена, саломы, канюшыны, якое наглядаецца ў радзе раёнаў БССР, усё яшчэ ня процістаўлены рашучыя меры барацьбы.

Не сустракае ў гэтых раёнах належнага адпору і кулак—асноўны вінавайца гэтага пагражаючага зьявішча.

Наадварот, адзначаецца нерспараджасьць і, нават, замяшанасьць урэгулюючых органаў у некаторых акругах і раёнах. У адных мясцох, напрыклад, загатоўка фуражу працягваецца ўзмоцненым тэмпам, у другіх-жа гэта катэгарычна забараняецца.

Цікава адзначыць, што з кожным днём усё павялічваецца попыт калгасаў на фураж.

ЗРУХУ НЯМА

Рамонт с.-г. інвэнтару яшчэ не пачаўся

Рамонтныя майстэрні не арганізаваны, чыгуначныя дэпо не нагружаны — такое становішча з арганізацыяй рамонту с.-г. машын і інвэнтару ў БССР. Не скарыстоўваюцца таксама і адпаведныя цэхі беларускіх металяпрадпрыемстваў, якія могуць з посьпехам рабіць запасныя часткі.

У Беларусі ёсьць каля дзесятка буйных чыгуначных майстэрань. Да гэтага часу зямельнымі органамі заключан дагавор толькі з менскімі майстэрнямі. Аб ступені выкарыстаньня чыгуначных майстэрань сьведчаць наступныя даныя: у Аршанскае дэпо паступілі для рамонту... тры трактары; а жлобінскія майстэрні атрымалі... заказ на выраб 150 кольцаў для прывязі кароў. І гэта ў той час, калі Жлобінскія майстэрні зьяўляюцца буйнейшымі для БССР і прызначаны для рамонту складаных с.-г. машын.

ВСНГ Беларусі выдзеліў для рамонту рад прадпрыемстваў. Стварыліся нават спэцыяльныя ўдарныя рабочыя брыгады. Так, прадпрыемствы і брыгады не дачакаліся заказаў ад зямельных органаў і... загрузілі сябе заказамі іншых арганізацый.

Становішча ўскладняецца адсутнасьцю чорнага і каляровых матэраляў. Вызначаны да завозу для патрэб рамонтных майстэрань матэраль паступае зусім нездавальняюча. Месячнік збору лому пакуль што рэальных вынікаў не дае.

Дрэнна ідзе паступленьне абсталяваньня новых рамонтных майстэрань. Замест 143 камплектаў абсталяваньня пакуль што прыбыло толькі 15.

Адсутнасьць зруху ў справе разгортваньня рамонтаў тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што зямельныя органы ўсё яшчэ праяўляюць мала ініцыятывы. Акрамя таго, няма ўплываваньня разьмеркаваньні машын і трактароў, якія патрабуюць рамонту сярод майстэрань і прадпрыемстваў.

Нельга прызнаць здавальняючым тэмп завозу с.-г. машын. На 20-га лютага завоз па плугох выпаданы на ... проц., а па культурных плугох — ... проц. Барон розных завезена 62 проц. а пружыновых 25,8 проц. Зусім дрэнна з паступленьнем акучнікаў. Да гэтага часу віцебскі завод «Чырвоны Мэтальіст» адгрузіў іх усяго 3,2 проц. плану. Розных сявярак ім адгружана 45 проц. плану, а дыскавых — 18,49 проц.

Усё яшчэ не паступаюць трактарныя прылады. Не атрымана ні адной трактарнай цялежкі, бараны і г. д.

У апошні час з раду акруг насыпаюцца скаргі на дрэнную якасьць завозных збожжаачышчальных машын. Аршанская і Бабруйская акругі паведамляюць, што атрыманыя імі збожжаачышчальныя машыны ня могуць быць выкарыстаны таму, што яны прыбылі бязтаў і маюць рад недахопаў ...ыснага ...радку.

НЯМА ЧАГО РАМАНТАВАЦЬ!?

Магчымасьці, якія мае Аршанская округа ў галіне арганізацыі рамонту с.-г. інвэнтару, **не скарыстоўваюцца.** Аршанскія чыгуначныя майстэрні вылучылі нават спэцыяльныя брыгады для рамонту трактараў і машын, але работа ня ідзе таму, што ніхто не прысылае ні трактараў, ні машын.

У раёнах ня ведаюць аб тым, што машыны і інвэнтар можна рамантаваць у аршанскіх чыгуначных майстэрнях. Зямельныя органы не паклапаціліся каб паведаміць аб гэтым месцы. У ніку мы маем такія недапушчальныя выпадкі. **Саўгас Вусьце, які знаходзіцца ...ад адпраўкі некалькіх кілёмэтраў ... Воршы, зьбіраецца адправіць свой трактар для рамонту ў РСФСР, а саўгас «Райк...» — у Магілеўшчыну.**

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Паўстаньне ў Інда-Кітаі мела яскравы рэвалюцыйны характар

Масавыя арышты паўстанцаў працягваюцца

ПАРЫЖ, 24. Паводле афіцыйных вестак, за апошнія дні ў Інда-Кітаі арыштавана 211 удзельнікаў паўстаньня, у тым ліку 56 салдат. Пасьля доўгіх шукальняў, арыштаваны тры кіраўнікі паўстаньня. Сярод іх—прыгавораны ў ліпені 1929 г. да пажыцьцёвае катаргі за рэвалюцыйную работу **Тхай-Хок,** якога газэты называюць правадыром паўстаньня. З паведамленьняў аб масавых арыштах відаць, што паўстаньне ў Інда-Кітаі ахапіла большы раён, чым можна было меркаваць паводле папярэдніх паведамленьняў. Паўстаньне, бясспрэчна, мела вельмі выразны характар масавага рэвалюцыйна-клясавага руху, у працэсе якога рабочыя, сяляне, салдаты і рэвалюцыйная інтэлігенцыя аб'ядналіся супроць французкіх улад.

(ТАСС).

Французкія рэакцыянэры ў замяшаньні

ПАРЫЖ, 24. Рэвалюцыйныя падзеі ў Інда-Кітаі паранейшаму служаць поводам для анты-савецкай кампаніі французкіх газэт, якія выдумваюць усякія недарэчнасьці аб атрыманьні інда-кітайскімі камуністымі інструкцый з Масквы і г. д.

Рэакцыйная «Лібэртэ», зразумела, лічыць, што Інда-Кітайскае паўстаньне зьяўляецца выстарчальнаю прычынаю для разрыву дыпляматычных адносін з СССР. Газэта лічыць, што найлепшым сродкам для спыненьня рэвалюцыйнага руху ў французкіх калёніях зьяўляецца адазваньне т. Даўгалеўскага з Парыжа. Крайне-правая газэта «Амі дю Пэпль» зазначае, што побач з узмацненьнем французкіх афіцэрскіх кадраў у Інда-Кітаі для лепшага кантролю над тубыльнымі войскамі, трэба спыніць прыплыў інда-кітайскіх тубыльцаў у Францыю. Па тэй-жа прычыне газэта прапануе спыніць перакідку інда-кітайскіх войскаў у Францыю. Газэта заклікае да згуртаваньня ўсіх зацікаўленых вялікіх калёніяльных дзяржаў да барацьбы з рэвалюцыйным рухам у калёніях.

Характэрна, што сацыялістычная прэса, цалкам зацікаўленая парламэнцкай вазьнёй у сувязі з утварэньнем «левага» ўраду, не зварачае ніякае ўвагі на рэвалюцыйныя падзеі ў Інда-Кітаі. Хутчэй асвойваючыся з новай роляю ураднага органу, сацыялістычная прэса спыніла ўраду Тардзе, гэта—«вычэрпваючай інфармацыі і суровага расьсьледваньня падзеяў в Інда-кітаі».

Ня менш характэрна, **што Шотан,** у ...давая праграма якога **не сустракае** ...якіх супярэчаньняў з боку сацыялістаў (сацыялістыя гэтымі днямі бязумоўна ухваляць афіцыйную **пастанову** аб ...трыманьні новага ўраду), заяўляе журналістам, што калі яму будзе прад'яўлена патрабаваньне аб новых крэдытах ...ваенныя апэрацыі ў паўднёвым Марокко, дык ён «уважліва і з прызнаньнем ...казнасьці» адносіцца да гэтага патрабаваньня. (ТАСС).

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ Ў БУРЖУАЗНЫХ АРМІЯХ

За 1929 год у французкай арміі адзначана 110 масавых выступленьняў салдат арміі і запасных у 75-80 часьцях усіх відаў зброі. Гэтыя выступленьні выкліканы дрэнным харчаваньнем, хамскім абыходжаньнем, стамляючымі манэўрамі і прасьледваньнем рэвалюцыянэраў. Салдаты абвяшчалі забастоўкі, адмаўляліся выконваць загады начальства да задаваленьня іх патрабаваньняў. У дзесятках выпадкаў выступленьні вылываліся ў дэманстрацыйнае харавое пяньне «Інтэрнацыяналу». Праўда, салдаты адкажуць за свае выступленьні катаргай, ссылкай, турмой, але нішто ня можа прымусіць іх забыць гукі і словы «Інтэрнацыяналу», які—як гэта нядаўна з жахам паведамляліся ў французкай вайсковай часопісі—пяецца нават маракамі-нэграмі на ваенных суднах, што ідуць па шырокаму Конга, у далёкай Афрыцы.

У працягу 1929 году адзначаны таксама рад выпадкаў **братаньня войска з рабочымі-забастоўшчыкамі,** усьміраць якіх яны пасылаліся. Асаблівую славу атрымалі леташнія падзеі ў дэпартаманце Луары, калі на дапамогу прадпрыемцам у іх барацьбе з гарнякамі ўрад паслаў войска. Прыбыўшы ў Гранкомб і Понтыль, салдаты пачалі братацца з рабочымі. Салдаты дапускалі рабочых рвацць электрычныя правады, якія падаюць ток у рудні, гасіць печы, спыняць машыны і выганяць штрэйкбрэхэраў і нават вылучылі сваіх салдацкіх дэлегатаў у забастовачныя камітэты.

Адданасьць камунізму выказалі многія тысячы французкіх салдат і маракоў, калі буржуазія накіравала свой паход супроць газэты французкіх камуністых «Юманітэ». Жыцьцё або сьмерць газэты залежала галоўным чынам ад ахвяраздольнасьці французкага пралетарыяту. Яе хапіла, каб выратаваць газэту. У тых сотнях тысяч франкаў, якія былі атрыманы газэтай, шмат тысяч склала дадаткі з разорваных сантымаў і франкаў, што пасылаліся салдатамі і маракамі.

У апошні час сувязь рэвалюцыйных салдат з рэвалюцыйнымі рабочымі выказалася ў форме **шэфства рабочых над салдатамі.**

Зьезд чыгуначнікаў і рабочых чыгуначных майстэрань Парыскага раёну, які адбыўся нядаўна ў Парыжы, ухваліў пастанову аб шэфстве над пятым пяхотным палком.

У Грэцкім горадзе Сэрэсе здарыўся такі выпадак. Афіцэр абвясьціў батальёну, што з прычыны пагалоўнага заражэньня салдат бальшавізмам—скасаваны водпускі на сьвяты. У адказ—увесь батальён, як адзін чалавек, у арганізаваным парадку разыйшоўся па вёсках.

Гэты выпадак далёка не адзінкавы.

У Чаха-Славакіі ў радзе гарадоў зарэгістраваны шматлікія выпадкі простае непаслухмянасьці цэлых часьцей, якія выступалі пад лёзунгамі кампартыі. У адным з правінцыяльных гарнізонаў некалькі сот салдат з чэскаю рэвалюцыйнаю песьняю «Далоў катаў і здрадніка» прайшлі па вуліцах гораду. У дзень заканчэньня вялікіх манэўраў амаль увесь 34-ты пяхотны полк запяяў хорам «Інтэрнацыянал» і песьню камуністычных спартыўных арганізацый.

Настрої **польскіх** салдат таксама выклікаюць нямалую трывогу буржуазіі. Падпольныя рэвалюцыйныя часопісі і лістоўкі карыстаюцца ўсё ўзрастаючым посьпехам сярод салдацкіх мас. У Лодзі салдаты 28 палка прышлі на дапамогу рабочым і беспрацоўным, на якіх напала паліцыя. У Менску-Мазавецкім уланы разагналі баявую фашысцкую дружыну пэпэсэўцаў, якія прабавалі разагнаць рабочы мітынг. На польскіх акраінах, у Заходняй Украіне і заходняй Беларусі, якія стогнуць пад ярмом польскае буржуазіі, таксама адзначаны выпадкі братаньня войск з сялянамі.

Тое, што адбылося нядаўна на борце нямецкіх **крэйсэраў** «Эмдэн» і «Гэссэн», сьведчыць, што і ў кубрыкі і качагаркі ўнутры армії. Але нішто ня зможа спыніць далейшага рэвалюцыянізаваньня рабочых і працоўных сялян, апранутых у салдацкую шынэльку.

І. Э.

Каманда французскага крэйсэра «Эдгар Кінэ» (які нядаўна наткнуўся на мель і загінуў) у часе прабываньня ў амэрыканскіх партох браталася з рэвалюцыйнымі амэрыканскімі рабочымі. На крэйсэры «Вальдэк Русо» ў часе знаходжаньня яго восеньню 1929 году ў паўднёва-кітайскіх водах выбухнула паўстаньне; матросы арыштавалі афіцэраў, сарвалі трохкаляровы сьцяг французкай буржуазнае рэспублікі і паставілі на яго месца чырвоны сьцяг. Паўстаньне было задушана толькі пасьля прыбыцьця на дапамогу амэрыканскага крэйсэра «Пітсбург».

Як-бы заварэньнем агульнага малюнку зьявілася нядаўняе паўстаньне тубыльных войск у Індакітаі. Імпэрыялістыя адбіраюць асобныя групы калёніяльных тубыльцаў, дрэсыруюць іх звычайна пры дапамозе папоў, потым навучаюць іх вайсковай справе. Іх трымаюць напагатове: папершае, на выпадак вайны, калі іх скарыстаюць, як «гарматнае мяса».

Другая-ж задача—усьміраць унутраныя паўстаньні тубыльцаў. Але ў Індакітаі асобныя атрады ўсьмірыцеляў абярнуліся ў саюзьнікаў паўстаўшых.

***

Міжнародная буржуазія бачыць рост рэвалюцыйных настрояў у салдацкіх масах. Расьце яе трывога, а разам з ёю шырыцца і барацьба з «чырвонай небясьпекай». Барацьба ідзе ня толькі на лініі лютых пакараньняў і рэпрэсій, але і шляхам шалёнай агітацыі, дзікага паклёпу на СССР, «міратворчай» ідэяй паноўскай прапаведзі, распальваньня нацыянальна-патрыятычнай агітацыі. Вялікую работу па выхаваньні салдат у пажаданым для капіталу духу вядуць і фашыстыя і сацыял-фашыстыя. У арміях моцныя таксама і буржуазныя і кулацкія элементы, якія шпіёняць за пралетарскімі і бядняцкімі кадрамі ўнутры арміі. Але нішто ня зможа спыніць далейшага рэвалюцыянізаваньня рабочых і працоўных сялян, апранутых у салдацкую шынэльку.

І. Э.

Першая выстаўка пралеткультуры ў Бэрліне

БЭРЛІН, 22. У цэнтры Бэрліна, на Пастадамскім пляцы, адкрылася першая ўсенямецкая выстаўка пралетарскае культуры. Выстаўка арганізавана нямецкімі рэвалюцыйнымі культурна-асьветнымі арганізацыямі. Выстаўка мае на мэце паказаць разьвіцьцё пралетарскае культуры ў Савецкім Саюзе і ў капіталістычных краёх.

Пры ўваходзе зьмешчаны экспанаты нямецкага саюзу прыхільнікаў СССР. У аддзеле «Праўда аб Савецкім Саюзе»—старанна сабраны матар'ялы, якія навочна даводзяць паклёпніцтва сацыял-дэмакратычнага і буржуазнага друку на СССР і даюць глядачом сапраўдны малюнак сацыялістычнага будаўніцтва. Побач знаходзіцца аддзел «Антырэлігійнага саюзу свабодамысьлячых», выставаныя матар'ялы якога зьяўляюцца вельмі добраю прапагандаю супроць царквы і выкрываюць яе рэакцыйную сутнасьць.

Улічваючы, што пралетарская кніга зьяўляецца духоўным сродкам у выхаваньні барацьбе рабочае клясы, выставачны камітэт аддаў шмат месца рэвалюцыйным выданьням. Ілікім посьпехам на выстаўцы карыстаецца аддзел саюзу пралетарскіх тэатраў, дзе штодзенна даюцца пралетарскія п'есы.

На выстаўцы пралетаўлены таксама саюз кіноарганізацый, матар'ялы якога знаёмяць наведвальнікаў з рэакцыяй рэгіяналёсьсямі паміж кіно і капіталістычных краёх, дзе яно выкарыстоўваецца для таго, каб алцягнуць увагу рабочых клясы ад барацьбы з эксплёатарамі і ў Савецкім Саюзе, дзе кіно зьяўляецца мацнейшым сродкам палітычнага выхаваньня працоўных.

Апрача таго, на выстаўцы прымае ўдзел таксама рад пралетарскіх, спартыўных, музычных, эсэраўскіх і іншых арганізацый.

Замежны гандаль СССР у студзені

МАСКВА, 21. Паводле даных Наркамгандлю зварот замежнага гандлю СССР па эўрапэйскай граніцы у студзені 1930 году склаў 138,3 млн. руб. супроць 104,3 млн

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

ПРАМФІНПЛЯН МОЖА БЫЦЬ ПЕРАВЫКАНАНЫ

ЛЕПШЫ ДОВАД—ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ВЫТВОРЧЫХ ПРАГРАМ НА РАДЗЕ ПРАДПРЫЕМСТВАУ

Энтузіязм рабочых—перамог

Першыя посьпехі „Чырвонага Мэталіста"

Другая дэкада лютага прынесла значнае перавыкананьне вытворчай праграмы па выпрацоўцы плугоў: замест 6.345, паводле праграмы, выпушчана 7.575, г. зн. **119,3 проц.** Малатарань выпушчана 106,8 проц., арфаў 106,5 проц. Затое па вырабе конскіх прывадоў і саломарэзак праграма значна недавыканана: па конскіх прывадох **на 19,5 проц.** і па саломарэзках—**на 66,2 проц.** (конскіх прывадоў замест 180 зроблена 145, саломарэзак замест 189 зроблена 64). **Рабочыя „Чырвонага Мэталіста" павінны яшчэ з большай рашучасьцю павесьці барацьбу з усімі недахопамі, як на вытворчасьці, так і ў кіраўніцтве.**

Домбалеўцы выпраўляюць дрэннае кіраўніцтва

Н.-БАРЫСАЎ. Агульны сход рабочых гуты імя Домбаля, адзначаючы, што вытворная праграма за першы квартал недавыканана на 4 з пал. проц., дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту недавыкананa на 2,1 проц., прадукцыйнасьць працы здстае на 11 проц., бачыць асноўную прычыну ў НЕВЫСТАРЧАЛЫМ ГАСПАДАРЧЫМ КІРАЎНІЦТВЕ ПА АСОБНЫХ ГАЛІНАХ РАБОТЫ І ПАТРАБУЕ ПОЎНАГА АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНА - ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ.

Агульны сход ГАНЬБІЦЬ НЯДБАЙНАСЬЦЬ ЗАЎКОМУ І ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА ЗА АЛСУТНАСЬЦЬ У ЦЭХАХ ПРАМФІНПЛЯНАЎСКІХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ, ЗА НЕАФАРМЛЕНЬНЕ ЎДАРНЫХ БРЫГАД І САЦДАГАВАРОЎ ПА ЦЭХАХ І ЗЬМЕНАХ.

Для выкананьня прамфінпляну сход патрабаваў паставіць яшчэ адзін варштат па вырабе гатуновага начыньня і пачаць рашучую барацьбу з прагульшчыкамі. Для ліквідацыі прарыву ў выкананьні прамфінпляну за першы квартал агульны сход пастанавіў арганізаваць нядзельнік.

Партыйная маса абвясьціла сябе мобілізаванай на дапамогу выкананьню прамфінпляну і УЗМАЦНЕНЬНЮ КІРАЎНІЦТВА ЎДАРНЫМІ БРЫГАДАМІ.

Рабочыя гуты імя Домбаля запэўняюць партыю ў тым, што ПРАМФІНПЛЯН БУДЗЕ ВЫКАНАНЫ.

Л. С.

ЛЕПШЫ РАБОЧЫ

Тав. Таболін Н.—рабочы чырвонадубнага цэху гарбарні «Бальшавік». Працоўны стаж 25 год. Норма выпрацоўкі 80 пар галяніншчаў, у дзень вырабляе 100-105 пар. Тав. Таболін—старэйшы брыгадзір.

КАСТРЫЧНІК ЗНОЎ УПЕРАДЗЕ

Швэйная фабрыка «Кастрычнік» (Менск), якая ў студзені выпрацавала толькі 82 проц. вытворчай праграмы, зараз, у **першай палове лютага** дала значны пералом: вытворчая праграма выканана **на 104 проц.**

Пляны перавышаны

Бярэце прыклад з лепшых

◆ Папяровая фабрыка «ГЭРОЙ ПРАЦЫ» (Добруш) за першую палову лютага выканала сваю вытворчую праграму на 98,6 проц. За студзень фабрыка выканала праграму на 101,8 проц.

◆ Папяровая фабрыка «СПАРТАК» (Шклоў) выканала вытворчую праграму за першую палову лютага на 103,5 проц. За студзень — на 108,4 проц.

◆ Папяровая фабрыка «ПРАФІНТЭРН» (Нова-Барысаў) за першую палову лютага выканала вытворчую праграму на 107 проц. За студзень — на 100 проц.

◆ Кардонная фабрыка ІМЯ СТАЛІНА (Рагачэў) за першую дэкаду лютага выканала вытворчую праграму на 105,3 проц. У студзені праграма выкананa на 111,7 проц.

◆ Кардонная фабрыка ІМЯ ВАРОЎСКАГА (Сураж, Віцебскай акругі) выканала вытворчую праграму за першыя 10 дзён лютага на 117,9 проц., у студзені праграма выканана на 118,8 проц.

◆ Кардонная фабрыка ІМЯ ЛЕНІНА (Пухавічы) за першую дэкаду лютага выканала вытворчую праграму на 107,7 проц., студзень даў 119,4 проц.

◆ Цьвіковы завод «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» (Аршанская акруга) за першую дзесяцідзённую лютага, таксама, як і ў студзені выканаў сваю вытворчую праграму на 107,8 проц.

◆ БАБРУЙСКІ ЛЕСАКАМБІНАТ за першую дэкаду выканаў вытворчую праграму па пескапільным цэху на 100 проц.

◆ ЛЕСАЗАВОД «АДРАДЖЭНЬНЕ» (Гомельскай акругі) за другую дэкаду лютага выканаў вытворчую праграму на 110 проц.

◆ У ПЯКАРНІ МАЗЫРСКАГА ЦРК хлебны цэх добраахвотна павысіў норму выпрацоўкі на 25 проц., бупачны цэх на 35 проц. і цукерны на 50 проц.

Шчаціншчыкі ліквідуюць прарыў

БАБРУЙСК. (Наш. кар.). Рабочыя Бабруйскай шчаціннай фабрыкі энэргічна ўзяліся за ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну, аб чым пісала «Зьвязда». За 20 дзён лютага вытворчая праграма выканана на ўсе 100 проц. Прагулы ўпалі з 14 проц. да 6 проц.

А. МАГІДАЎ.

Па БССР

СУЦЭЛЬНАЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ ВУШАЦКАГА РАЁНУ

ВУШАЧЫ. (Наш. кар.). Канфэрэнцыя калгасьнікаў Вушацкага раёну (Полаччына) абвясьціла раён раёнам суцэльнае калектывізацыі. Канфэрэнцыя пастанавіла ў парадку ўдарнае работы абагуліць да 5-га сакавіка жывёлу, у трох калгасах арганізаваць ударныя брыгады. Раён калектывізаваны ўжо на 75 проц.

53 С.-Г. РАБОЧЫЯ І БАТРАКІ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ Ў ПАРТЫЮ.

КЛІМАВІЧЫ. (Наш. кар.). Адкрылася канфэрэнцыя батракоў і сельска - гаспадарчых рабочых; у рабоце канфэрэнцыі бярэ ўдзел звыш 80 дэлегатаў. Канфэрэнцыя абмяркоўвала пытаньне аб далейшай рабоце сярод батрацтва ў сувязі з суцэльнай калектывізацыяй.

53 с.-г. рабочыя і батракі падалі калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю. Сярод падаўшых—15 батрачак.

ЧЫГУНАЧНАЯ КАТАСТРОФА НА СТ. ТАЛАЧЫН — ВЫНІК ШКОДНІЦТВА

ТАЛАЧЫН. (Наш. кар.). Нядаўна ў газэце «Зьвязда» паведамлялася аб чыгуначнай катастрофе на ст. Талачын. Расьсьледваньне выявіла, што тут мы маем справу з чарговай вылазкай шкоднікаў.

Галоўны вінавайца катастрофы — ДСП Караньковy, атрымаўшы тэлеграму аб тым, што шлях, заняты рабочым цягнікам, не агаражаў яго належнымі сыгналамі, а пазадваро пусьціў па ім таварны цягнік.

Працаўнік 2-га аддзяленьня ст. Ворша Канюх, атрымаўшы паведамленьне аб тым, што пасустрач аднаму цягніку ідзе другі, што катастрофа немінуча, не прыняў ніякіх мер, каб папярэдзіць крушэньне, хоць меў магчымасьць пасылаць аўтадрэзіну, каб папярэдзіць рабочы цягнік.

Старшы дарожны майстар Воранаў, які таксама ведаў аб тым, што цягнік ідзе на цягнік, не ўзяняў трывогі ні ўжыў ніякіх захадаў, каб спыніць таварны цягнік.

ДСП Караньковy ў свой час агітаваў супроць пераходу на 8-гадзіннае дзяжурства, за што быў зьняты з пасады сакратара мясцкому. Ён меў рад спагнаньняў за бюракратызм і парушэньне правіл службы.

З месц паступаюць патрабаваньні рабочых аб суровым пакараньні шкоднікаў.

Віцебская школа сплаву —ударная брыгада

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Нядаўна на агульным сходзе курсантаў школы сплаву абмяркоўваўся даклад прадстаўніка ВСНГ тав. Лосева аб задачах школы сплаву і вывазцы лесу.

У прынятай рэзалюцыі сход, надаючы вялізнае значэньне недыходзячаму сплаўнаму пэрыяду, пастанавіў: АБВЯСЬЦІЦЬ ШКОЛУ ЎДАРНАЙ БРЫГАДАЙ, МАБІЛІЗАВАНАЙ ДЛЯ ДАПАМОГІ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СПЛАВУ.

Сход выбраў дэлегацыю ў складзе 7 чалавек, якой даручана зьвязацца з АК партыі, КСМ і РСІ і аказаць ім дапамогу ў рабоце.

Уся арганізацыйная праца па афармленьні брыгад праведзена. Школа разьбіта на 9 брыгад і разьмеркаваны раёны дзейнасьці. Гэтымі днямі пасьля інструкцыйнае нарады брыгады разьяжджаюцца.

Ударнікі абяцалі ўсю сваю сілу, усю сваю энэргію і ініцыятыву аддаць пастаўленым перад імі задачам.

АНТОНАЎ.

Тэмп калектывізацыі перавышае ўсе меркаваньні

ВОРША. (Наш кар.). 2 тыдні назад у Аршаншчыне налічвалася 460 калгасаў на плошчы 280 тысяч гэктараў. Акруга была калектывізавана на 52 проц.

Зараз па акрузе налічваецца 528 калгасаў; калгасамі ахоплена 57 проц. гаспадарак і 59 проц. плошчы акругі.

Найбольшы лік калгасаў арганізаваўся ў Багушэўскім раёне.

Збор жалезнага лому

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Па акрузе разгарнуўся збор жалезнага лому і другарадных відаў экспарту. Паход па ўтыль у Бабруйску даў 15 тон бляхі, 10 тон чорнага металю, звыш вагону каляроваага металю, 400 пудоў рызьвэ і г. д.

У Глуску сабрана 2.000 кілё рызьвэ, 3.000 кілё жалеза, 300 кілёграм бляхі і г. д.

Партыйнае будаўніцтва

Бальшавіцкай самакрытыкай

выкрывайце і папярэджвайце

апартуністычныя скажэньні ў практычнай рабоце

Аздаравіць ячэйку Аўтакіраўніцтва

Гэтымі днямі былі заслуханы вывады па праверцы ячэйкі КП(б)В аўтакіраўніцтва (Менск). Здаецца, што партыйная ячэйка павінна была завастрыць сваю ўвагу наўкола «вузкіх» месц у практыцы ячэйкі, выяўленых праверкомам. Аднак, на сходзе частка камуністых імкнулася замазаць вывады праверкому і абараніць некаторых адказных камуністых, вычышчаных паводле пастановы праверкому з радоў партыі.

Паламо факты. Старшыня праверкому абвяшчае пастанову камісіі па кандыдатуры Грузінскага (былы дырэктар аўтакіраўніцтва). Пералічваецца рад учынкаў Грузінскага нявартых камуністага. Працуючы ў Бэрліне ў гандлёвым прадстаўніцтве, Грузінскі на працягу аднаго-двух год злоўжываў сваім становішчам, растраціў некалькі тысяч долараў, пахватаў ва ўсіх савецкіх установах у Бэрліне да 1.000 марак для сваіх уласных мэт, гуляў на рулетцы ў Монте-Карла і г. д. Атрымаў за ўсё гэта суровую вымову з папярэджаньнем ад партыйнай ячэйкі савецкага гандлёвага прадстаўніцтва ў Бэрліне. Прыехаўшы ў Менск і стаўшы дырэктарам аўтакіраўніцтвам, Грузінскі стаў п'янствавать. Паводле пастановы МенАКК, Грузінскі атрымаў вымову і адхілены ад работы. На падставе ўсіх гэтых фактаў праверком выключыў Грузінскага з радоў КП(б)В. Трэба было чакаць, што партыйная ячэйка аднадушна ўхваліць пастанову праверкому аб выключэньні Грузінскага з партыі. Аднак, на сходзе былі выступленьні ў абарону Грузінскага. Напрыклад, сакратар ячэйкі КСМ Рабчынскі заявіў:

«Я ад імя ўсяе камсамольскае ячэйкі бяру на сябе сьмеласьць заявіць, што такога вытрыманага і адданага камуністага, як Грузінскі, мы ня маем. Таму пастанова праверкому аб выключэньні Грузінскага зьяўляецца няправільнай».

Другія камуністыя (б. дырэктар Белпагрузу, зам. нач. Белдортрансу і г. д.) таксама выступалі з прамовамі такога-ж зьместу, імкнучыся апраўдаць ганебныя учынкі Грузінскага тым, што ён разлажуўся ня ў СССР, а за мяжой. Проста кажучы, гэтыя партыйцы апраўдвалі разлажаньне Грузінскага... капіталістычным акружэньнем.

Відавочна ўся шкоднасьць гэтых выступленьняў. Грош цана тым камуністым, якія пры зносінах з чужымі нам клясамі разлагаюцца і губяць свой партыйны твар. Гэты факт выразна сьведчыць аб тым, наколькі яшчэ маюць месца хваранітыя зьявішчы ў гэтай ячэйцы, наколькі яшчэ ў гэтай ячэйцы разьвіты падхалімаж, кругавая парука.

У парадку самакрытыкі трэба спыніцца на вывадах праверкому. Вывады слаба адлюстроўваюць сапраўдны стан парт'ячэйкі. Праверком ня выцяг, як на лежыць па тых хваранітых зьявішчах, якія здараюцца ў ячэйцы. Не паказана, як належыць, слабасьць работы ячэйкі па сацыялістычным спаборніцтве, барацьбе за зьніжэньне сабекошту, барацьбе з п'янствам і г. д.

Мы спадзяемся, што вышэйшыя парторгаціі ўлічаць гэта і прымуць канкрэтныя меры па рашучым і глыбокім аздараўленьні партыйнай ячэйкі.

З. БЕЛЕНЬКІ.

У Лепелі самакрытыка не разгорнута

У **Лепелі (Полаччына)** самакрытыка не разгорнута. Аб гэтым сьведчыць цэлы рад фактаў, у прыватнасьці, справа, якая ўзьнікла наўкола старшыні Лепельскага райвыканкому — **Зайцава.**

На Зайцава паступілі заявы аб тым, што ён дапамагаў кулаком, быў дэзэртырам і падтрымліваў сувязь з чужым элемэнтам. Абвінавачаньні, як відаць, сур'ёзныя і патрабуюць самага дасканалага расьсьледваньня

Усе заявы на Зайцава разглядаліся на бюро Лепельскага РК КП(б)В. Бюро не праверыла фактаў, паданых у заявах, і змазала гэтае пытаньне. Член бюро РК тав. **Злычасьцеў** заявіў, што заявы на Зайцава зьяўляюцца хлусьнёй і таму гэтага пытаньня разглядаць ня трэба. Злычасьцева падтрымаў сакратар раённага камітэту тав. **Барысэвіч.** Ён, ня гледзячы на пратэст асобных членаў бюро (тав. **Курбацкага**), зьняў пытаньне аб Зайцаву.

Гэтага нельга інакш назваць, як грубым зацiскам. Бюро Лепельскага РК партыі было-б дэтальна расьсьледваць заявы і выявіць сапраўдны твар Зайцава. Тады-б бюро даведалася, што Зайцаў сапраўды абаранае інтарэсы варожых элемэнтаў. Вось факты.

Па прапанове Зайцава ў калгас імя Ленін прыняты кулацкі сынок Вусьцін пад шыльдай «спэцыяліста-ўчаля». Гаспадарку бацькі гэтага Вусьціна раскулачылі. Зайцаў не рэагаваў, як трэба, на антысавецкую вылазку настаўніка **Голікава,** зьвязанага з кулацкагандлярскімі элемэнтамі. Гэта тлумачыцца тым, што Голікаў зьяўляецца добрым знаёмым Зайцава.

Праверка работы фракцыі райвыканкому выявіла рад хваранітых зьяў. Член камісіі на праверцы работы фракцыі тав. **Кажарскі** па бюро райкома камітэту падаў ня мала фактаў, якія сьведчылі аб сур'ёзнейшых прарывах у дзейнасьці фракцыі. Аднак, далей аб меркаваньня на бюро райкому справа не пайшла.

З прычыны зацiску самакрытыкі ня былі своячасова папярэджаны скажэньні ў практыцы лепельскіх органаў. Разваліўся камбінат, крэдытная каапэрацыя дала вялікі дэфіцыт. у мясцовым апараце заселі кантрабандыстыя і г. д. Старшыня рэвізійнай камісіі спажывецкае каапэрацыі **Балатнёў** п'янствуе і падтрымлівае сувязь з элемэнтамі, пазбаўленымі права голасу. Райком на гэта не рэагуе.

Партыйная чыстка ў Лепелі ня выкрыла ўсіх скажэньняў. Чыстка апарату, якая праводзілася два разы, таксама не пакончыла з гэтымі агідными зьявамі. Кожны раз у камісію па чыстцы падавалася многа заяў аб учынках і паводзінах Зайцава, але ніякіх вынікаў няма.

Мы патрабуем прыняцьця безадкладных адпаведных мер. Бінаватыя ў зацiску самакрытыкі павінны быць суровa пакараны. Трэба выправіць няправільную лінію бюро Лепельскага РК у пытаньнях самакрытыкі.

А—н.

САМАКРЫТЫКА „НАОГУЛ"

Ва ўсебеларускай саўпартшколе (Гомель) самакрытыку разумеюць аднабока. Аб самакрытыцы гавораць толькі «наогул». На справе-ж самакрытыка ў школе зусім не разгорнута. Ёсьць цэлы рад фактаў грубага зацiску.

Так, на групавым сходзе слухачоў загадчык школы змазаў пытаньне аб адным выкладчыку, які ў часе прапрацоўкі тэмы «Рэвалюцыя 1905 году» папулярызаваў меншавіцкія погляды. На гэтым сходзе спрэчкі зусім былі забаронены. Ва ўхваленай пастанове было адзначана, што ўчынак выкладчыка зьяўляецца толькі «мэтадычнай памылкай і таму аб гэтым больш нідзе ня трэба гаварыць». Зусім аразумела, што такое вырашэньне пытаньня аб выкладаньні меншавіцкіх поглядаў зьяўляецца грубым зацiскам.

Факты зацiску, на жаль, не адзіночныя. Бюро партыйнага калектыву паставіла «на від» аднаму курсанту за тое, што ён даў адвод курсанту пры ўступленьні ў партыю і зьмясьціў крытычную заметку ў насьценгазэце. Гэты зусім правільны ўчынак бюро парткалектыву кваліфікавала як «склёчніцтва».

ПАШКЕЯЎ.

Па руках глушыцеляў самакрытыкі

У № 31 газэты **«Аднцябр»** паведамлялася аб замаху на самагубства рабкора **Грынбаўма,** рабочага шчаціннай фабрыкі.

Спроба пакончыць жыцьцё самагубствам тав. Грынбаўма зьвязана з агіднейшай справай, з цэлай сыстэмай цкаваньня з боку групы бундаўцаў, чужых элемэнтаў (былых фабрыкантаў і спэкулянтаў), якія пралезьлі на фабрыку.

Тав. Грынбаўм, як актыўны рабкор, змагаўся праз пасьценгазэту з хваранітымі зьявамі на фабрыцы, з правямі бундызму, шавінізму, з рэацтвам і асьмечнасьцью фабрыкі былымі фабрыкантамі і спэкулянтамі. Гэта ён быў ініцыятарам павышэньня норм выпрацоўкі і збору сродкаў у фонд індустрыялізацыі. Тав. Грынбаўм змагаўся з цахаўшчынай, якая наглядалася з боку майстроў і асобных рабочых.

На жаль, усё тое, аб чым пісаў і з чым змагаўся тав. Грынбаўм, не знаходзіла належнага падтрыманьня з боку бюро ячэйкі і адміністрацыі фабрыкі. Бюро ячэйкі і адміністрацыя фабрыкі не падтрымалі, як трэба, прапаноў тав. Грынбаўма аб павышэньні норм выпрацоўкі і выкліку рабочых на сацыялістычнае спаборніцтва.

Група былых бундаўцаў і чужых элемэнтаў на фабрыцы сыстэматычна цкавала т. Грынбаўма абвінавачваючы яго ў правакатарстве. Ён нават атрымаў апляўху ад групы шкурнікаў за сваю сьмелую крытыку. Бюро ячэйкі, фабзаўком і адміністрацыя, ведаючы аб цкаваньні тав. Грынбаўма, пляліся ў хвасьце і не рэагавалі на гэту агіднейшую справу

У часе праверкі партыйнай ячэйкі група шкурнікаў на фабрыцы прабавала скарыстаць чыстку для зьвядзеньня асабістых рахункаў з тав. Грынбаўмам. Яны выступалі супроць тав. Грынбаўма і абвінавачвалі яго ў правакацыйных учынках, пусьціўшы ў ход усялякія паклёпы. З боку праверачнай камісіі была дапушчана памылка ў тым, што праверком, не правяраючы фактаў, высунуў тых супроць тав. Грынбаўма, прапанаваў уступмацца ад пасылкі яго на работу ў вёску.

Бюро ячэйкі, фабзаўком і адміністрацыя шчаціннае фабрыкі не рэагавалі на хваравітыя зьявы, якія мелі месца на фабрыцы, не разумелі сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі. На фабрыцы зусім слаба адлюстроўваліся ў практычнай рабоце дырэктывы партыі па гаспадарчым будаўніцтве, сацыялістычным спаборніцтве і зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Трэба канстатаваць, што Кастрычніцкі раённы камітэт КП(б)В недаацаніў усіх гэтых фактаў і мала адлаваў увагі вывучэньню і зьнішчэньню хваравітых зьяў, якія мелі месца на шчаціннай фабрыцы. Кастрычніцкі РК абмежаваўся толькі некаторымі далёка нерашучымі мерамі і не давёў гэтае справы да канца.

Бюро Менскага АК КП(б)Б і прэзыдыум Мен. АКК, разгледзеўшы гэту справу, пастанавілі.

Бюро партыйнае ячэйкі вынесьці вымову і датэрмінова перавыбраць яго за дапушчаньня палітычныя памылкі. Праверкому суровa пакараць тых партыйцаў, якія прымалі ўдзел у цкаваньні тав. Грынбаўма і якія замазвалі хваравітыя зьявы на фабрыцы. Ячэйцы супольна з профгранам правесьці работу па ачышчэньні фабрыкі ад сацыяльна-чужых элемэнтаў (былых фабрыкантаў, гандляроў). Даручыць бюро ячэйкі, раённаму камітэту і ЦП саюзу гарбароў дабіцца рашучага правядзеньня на фабрыцы дырэктыў партыі ў галіне гаспадарчага будаўніцтва, разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва, зьніжэньня сабекошту і паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Ячэйцы трэба сапраўды кіраваць рабкораўскай работай, разгарнуць на фабрыцы сапраўдную бальшавіцкую крытыку і самакрытыку, накіроўваючы яе ў першую чаргу на зьнішчэньне недахопаў і хваравітых зьяў на вытворчасьці.

ЦУДЗІН.

Пазыка „Пяцігодку--у 4 гады"

Паводле пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР, у мэтах фінансаваньня пяцігадовага плану разьвіцьця народнае гаспадаркі, выпускаецца новая дзяржаўная пазыка пад назваю **«Пяцігодку—у чатыры гады».**

Новая пазыка павінна быць рэалізавана на працягу 1930-31 і 1932 г. і зьявіцца адзінаю пазыкаю фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Ідучы насустрач патрабаваньням шырокіх рабочых мас, урад СССР пастанавіў абмяняць усе аблігацыі 1-е, 2-е і 3-е пазык індустрыялізацыі народнае гаспадаркі і пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі на аблігацыі новае пазыкі.

Абмен павінен быць скончаны да 1-га студзеня 1931 году. Да гэтага тэрміну ўсім трымальнікам аблігацый забясьпечваюцца ўсе прыбыткі (процанты і выйгрышы), прадугледжаныя законам.

Наркамфіну СССР даручана выпусьціць новую пазыку не пазьней 1-га жніўня гэтага году.

З 1-га студзеня 1931 г. налічэньне процантаў і выграшаў пазык, якія належаць да абмену, спыняюцца.

Трымальнікі аблігацый пазык, якія знаходзяцца ў закладзе ў крэдытных установах і касах, могуць выкупіць свае аблігацыі, пагасіўшы пазычкі гатоўкаю.

Паводле прапаноў рабочых аб гарантаваньні доўгатэрміновага крэдыту ўрад СССР устанавіў **грамадзкі кантроль над продажам і закладам аблігацый.**

У далейшым аблігацыі могуць прадавацца і закладвацца толькі з дазволу камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту, якія павінны даваць дазвол у выпадках сапраўдных патрэбы ў продажы, або закладзе аблігацый.

Гэтыя дазволы выдаюцца рабочым і служачым—камісіямі садзейнічаньня пры прадпрыемствах і ва ўстановах, беспрацоўным—або камісіямі садзейнічаньня па месцы іх апошняе працы, або камісіямі садзейнічаньня пры гарадскім і раённым савеце.

Саматужнікам і пеарганізаванаму насельніцтву дазволы выдаюцца камісіямі пры гарсаветах і райсаветах, вясковаму насельніцтву—камісіямі пры сельсаветах. Пастановы пізаных камісій могуць быць абскарджаны пазыкатрымальнікамі перад фабзаўмясцкомамі і сельсаветамі.

Пастановы фабзаўмясцкомаў, сельсаветаў і камісій садзейнічаньня пры гарсаветах, або райсаветах зьяўляюцца канчатковымі.

Не пазьней 15-га сакавіка 1930 г. павінны быць арганізаваны камісіі садзейнічаньня ва ўсіх калектывах і сельсаветах.

На аснове пастановы ЦВК СССР Наркамфін СССР запрапанаваў зьняць з катыроўкі аблігацыі, якія павінны быць абменены на новыя пазыкі; спыніць куплю аблігацый і выдачу пазычак пад аблігацыі ва ўсіх крэдытных установах і ашчадкасах. Але для таго, каб даць магчымасьць рабочым і служачым, у вы падку сапраўднае патрэбы ў продажы і закладзе аблігацый, Наркамфін устанавіў парадак продажу і закладу аблігацый, якія належаць прапоўцым, з дазволу камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту.

Закон аб выпуску новае пазыкі і аб новай сыстэме распаражэньня аблігацыямі пазык зьяўляецца гарантыяй таго, што будзе забясьпечана доўгатэрміновасьць крэдытаў, якія даюцца працоўнымі на сацыялістычнае будаўніцтва.

Можна быць упэўненым, што новы закон, які выдасьцца паводле ініцыятывы перадавых рабочых, будзе з захапленьнем спатканы шырокімі рабочымі масамі.

В. Молатаў

НА ДВА ФРАНТЫ*)

I. В. А. Базараў, як саюзьнік правых

Чым-жа гэта заява Базарава, і ў прыватнасьці, заява аб «лішніх труднасьцях, якія мы «стараем», чым гэта заява адрозьніваецца ад таго, што гаворыцца ў дакуманце Рыкава, Бухарына і Томскага наконт магчымасьці дасягнень ня жаданых вынікаў «менш хваравітым шляхам»? Урэшце, у пазыцыі Базарава няма нічога розьнага з пазыцыяй т. т. Бухарына, Рыкава і Томскага. І беспартыйны Базараў, і трое цэкістых сходзяцца на тым, што «генэральная лінія» ашыбленчыла пэўныя посьпехі. Але ўсе яны ў адзін голас заяўляюць аб тым, што тэмп наступленьня рабочае класы «старае «лішніх труднасьці», зьяўляецца «хваравітым шляхам» і таму, як відаць, належыць зьмене.

У некалькі розных выразах, але па сутнасьці ўсім адно і тое-ж, заяўляюць і Базараў, і тройка лідэраў правых-ухілістых. Нельга ня прызнаць, што гэта вельмі папучальна.

Працытую яшчэ некалькі вытрымак, якія выкладваюць погляды Базарава. Вось, напрыклад, наступнае месца:

«Палажэньне трэба прызнаць вельмі цяжкім, і шансаў на няўдачу нашай палітыкі (заўважце: «нашай палітыкі»! В. М.) больш, чым на ўдачу. Аднак, з такой ацэнкі ня трэба рабіць вывад, што ён, Базараў, стаіць за адступленьне».

Як бачыце, Базараў гаворыць аб палітыцы ЎсеКП(б), як аб «нашай палітыцы».

Як заўважы лібэрал, як сапраўды буржуа, ён ня верыць у посьпех рэвалюцыі. Ён яго думы, «шансаў на няўдачу нашай палітыкі больш, чым на ўдачу». Але нават гэты пракісны лібэрал не стаіць за адступленьне. Набіраючы паветра ў лёгкія і адсоўваючыся яшчэ далей за сьпіну рабочых, ён «адважна заяўляе»:

«Пры даных умовах нельга ісьці ні на разьвязваньне рынку (чаго Бухарын ня разумеў у красавіку месяца!—В. М.), ні на павышэньне с.-г. цэн (чаго Бухарын таксама не разумеў!—В. М. Як ні нізкія шансы на посьпех, але зараз можна ісьці толькі ўперад».

Базараў, як бачыце, амаль што зразумеў, што ад ціхага тэмпу наступленьня бальшавікоў няма куды даваць, і ён «адважна» заяўляе, што «зараз можна ісьці толькі ўперад». Вось як мы моцна прыцісьнулі панову лібэралаў. Нават яны даганяраваюцца да заяў, «ісьці толькі ўперад».

Нарэшце, Базараў заяўляе, што «да яго, як беспартыйнага, ня могуць быць прад'яўлены патрабаваньні аб 100-проц. упэўненасьці». На гэты раз, пакуль, ён мае рацыю. Дае-ж ад Базарава патрабаваць «100-проц упэўненасьці» ў ігрэмозе рэвалюцыі! І бальшавіком трэба праваряць сваю палітыку фактамі, чэрпаць з практыкі новы матар'ял для паляпшэньня сваёй работы, не гаворачы ўжо аб тым, што нават у лепшай практычнай рабоце бываюць і асобныя памылкі. Мы ведаем, што лінія ў ленінскай партыі правільная, маркэсцкая. Але і партыі прыходзіцца выпраўляць асобныя элемэнты сваёй работы і сыстэматычна сачыць за тым, што новага ўскладзенае практыка. Аднак, у агаворцы Базарава аб тым, што з яго, як беспартыйнага, нельга патрабаваць 100-проц. упэўненасьці, ясна стырчыць хвосьцік буржуазнага лібэрала, які ня верыць у пралетарскую рэвалюцыю. Таму і яго заява наконт згоды з лініяй партыі грош цана.

З другога боку, мы бачым, што ў асноўным заява Базарава, па сваёй палітычнай пазыцыі, нічым не адрозьніваецца ад таго, што сказана ў дакуманце Томскага, Рыкава і Бухарына. Але, таварышы права-ўхілістыя, калі вы атрымліваеце сабе такога новага саюзьніка, як Базараў, або, прынамсі, палітычна набліжаецеся да гэтага буржуазнага лібэрала, то ніяк нельга вас вітаць з гэтым. Невялікі ў гэтым гонар для бальшавіка! І вы яшчэ думаеце дабівацца «роўнапраўнасьці» вашага цункту погляду з пунктам погляду партыі! Ленін адмоўдеся, нічога з гэтага ня выйдзе.

Я цытаваў заяву Базарава аб посьпехах нашай палітыкі. Як-ніяк, гэта ўсё-ж былы бальшавік, былы марксыст, а ў сучасны момант савецкі работнік.

А цяпер-жа ня толькі былыя рэвалюцыянэры і цяперашнія работнікі савецкага апарату прызнаюць посьпехі саветкае ўлады. Усім вядома, што аб гэтых посьпехах піша ў «Берлінэр Тагеблят» нават пан Шэфэр, што ў «Дэйлі Гэральд» аб тым-жа піша пан Фарбман і шмата іншых карэспандэнтаў буржуазных газэт вымушаны ў сваіх пісаньнях прызнаваць буйныя посьпехі савецкае ўлады ў справе зьяўніцця індустрыі, у справе ўздыму сельскае гаспадаркі, у ажыцьцяўленьні калектывізацыі і г. д. А хто-ж ня ведае, што ўсе гэтыя Шэфэры і Фарбманы—нашы ворагі, ворагі заядлыя, ворагі да канца?

Таму расьпісацца ў прызнаньні некаторых посьпехаў партыі і савецкае ўлады ўсім мала для тых, якія вядомы ў якасьці лідэраў правага ўхілу і да гэтага часу ад сваіх памылак не адмовіліся. Чаго варты такія прызнаньні посьпехаў і заявы аб зьяўленьні разгалосьсяў, калі гэта робіцца ўсё ж адкрытага асуджэньня сваіх права-ўхілісцкіх хістаньняў? Такія адносіны да прыкладных пытаньняў могуць сьведчыць толькі аб адсутнасьці ўсякай прынцыповасьці і аб простай бізідзёвасьці. Партыя ня можа абмежавацца канстатаваньнем посьпехаў. Яна павінна ведаць і ведае, якой палітыкай, якой работай і пры якіх умовах і, разам з тым, супроць каго, супроць чыйго супраціўленьня, супроць чыёй барацьбы і замаскаванага сабатажу работы партыі дасягнуты гэтыя посьпехі.

У сваім дакуманце Рыкаў, Бухарын і Томскі ня раз заяўляюць: мы—ня правыя. На першай-жа старонцы гэтага дакументу гаворыцца аб «няправільнасьці і палітычнай шкоднасьці ўсіх спроб павярнуць партыю «назад да XIV зьезду». У гэтых словах аўтары заявы знайшлі патрэбным, так сказаць, адмежавацца ад Фрумкіна. Праз паўтара тады пасьля выступленьня т. Фрумкіна яны—і то ў завуаліраным выглядзе—адмяжоўваюцца ад яго. Але ад каго вы, таварышы, адмяжоўваецеся? Вы-ж пашлі далей Фрумкіна ў дзесяць раз! Хіба т. Фрумкін гаварыў што-небудзь падобнае наконт палітыкі партыі ў вёсцы, наконт барацьбы з бюракратызмам, наконт палажэньня ў Камінтэрне, наконт ваенна-фэадальнай эксплёатацыі сялянства? Хіба што-небудзь падобнае гаварыў Фрумкін? Вы пайшлі ў дзесяць раз далей Фрумкіна ўправа і пасьля гэтага знайшлі зручным «адмежавацца» ад Фрумкіна. Хіба гэта варта палітычных кіраўнікоў? Вы-ж абагулілі і давялі да канца памылкі Фрумкіна. Вы зрабіліся сапраўдным рупарам тых настрояў, якія ў параўнаўча слабой форме выказаў у мінулым годзе т. Фрумкін. І цяпер вы б'яце на тым-жа Фрумкіну. І такімі адносінамі да сваіх прыхільнікаў і поўпрыхільнікаў вы думаеце заваяваць у каго-небудзь давер'е? Не, гэта нічога ня мае агульнага з прынцыповасьцю, з ідэёвасьцю. Больш таго. Я ня ведаю цяперашнія пазыцыі т. Фрумкіна, але не выключаю таго, што ён цяпер бліжэй да лініі партыі, чым вы тройка, бо ісьці далей вас управа, ада ецца, ужо няма куды.

Трое ў сваім дакуманце заяўляюць мы—не прыміренцы. Відаць, што ў ня ай партыі не папулярныя ні правыя ні прымірэнцы да правых. Гэта вы да вялі сваімі заявамі.

Але хто-ж вы? «Левыя», ці што? Не падобна. Не паверыць ніхто, што вы левыя. Ну, скажам, Шацкін—«левы». Ла мінадзо—«левы», прыпамсі, нядаўна быў «левым», цяпер ён прызнае сваё «левыя» памылкі. Але вы—«левыя»? Нават не падобна на гэта, ва ўсякім выпадку ніхто гэтаму не паверыць. Хто-ж вы такія, калі вы, тым ня менш, ня згодны з ЦК і з партыяй?

Калі ўспомніць або прачытаць тое, што вы нагаварылі за апошні час, або тое, што вы гаворыце цяпер, то як гэта назваць? Ва ўсякім выпадку тое, што вы прапаведуеце, гэта—**яўны апартунізм, г

КАЛГАСЫ БЯЗ ВЫТВОРЧЫХ ПЛЯНАЎ

КАЛГАССАЮЗЫ СЛАБА КІРУЮЦЬ АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ

Сустрэнем вясну арганізацыйна-падрыхтаванымі, выкарыстаем кароткі тэрмін да веснавых дзён

Сродкі ад самаабкладаньня зьбіраюцца вельмі дрэнна

—1.660 тыс. р. нядоімак на 15 лютага.—Тэмп паступленьняў зьніжаецца. —Шмат купакоў нічога ня плацяць. —Значная нядбайнасьць мясцовых органаў Гомельшчыны і іншых акруг

Сацыялістычная рэканструкцыя вёскі патрабуе асабліва поўнага выкананьня ўсіх фінансавых плянаў. Пяць з паловай міл. руб. самаабкладаньня павінны былі поўнасьцю паступіць у вызначаны тэрмін, каб забясьпечыць свачасовае задаваленьне культурных патрэб вёскі. Між тым, на 15 лютага па БССР застаецца 1.660 тыс руб. нядоімак самаабкладаньня, г. зн. 30 проц. прынятых сум яго.

Апараты акрфінадлзелаў, райвыканкомаў і сельсаветаў праяўляюць значную нядбайнасьць у гэтай справе. Толькі Аршанская акруга сабрала 93 проц. самаабкладаньня. Па іншых акругах нядоімка складае: у Віцебскай—24 проц., у Мазырскай—25 проц., у Бабруйскай—30 проц., у Магілеўскай—31 проц., у Полацкай—37 проц., у Менскай—40 проц., а у Гомельскай—аж 45 проц.

За апошні час тэмп збору прынятых сум зьменшыўся амаль утрая: за час з 15-I да 15-II было сабрана 736 тыс. руб., а за час з 1-II да 15-II—толькі 265 тыс. руб. Гомельшчына за гэтыя два тыдні дала толькі 37 тыс. руб. Цяпер ужо прыходзіцца адзначаць не пагрозу, а факт зрыву кампаніі самаабкладаньня.

Сваю бязьдзейнасьць і нядбайнасьць некаторыя працаўнікі апраўдваюць «абъектыўнымі» умовамі. У прыватнасьці тым, што ўвесь апарат заняты калектывізацыяй, абагуленьнем насеньня і г. д. Але такія апраўданьні толькі сьведчаць пра палітычную нішэмненасьць тых, хто іх прыводзіць.

Збор самаабкладаньня арганізацыйна можна і трэба зьвязаць з іншымі кампаніямі, якія зараз праводзяцца ў вёсцы. Гэта тым больш неабходна, што значная частка нядоімак застаецца за кулакамі і заможнікамі. Ёсьць факты, калі кулакі не плацілі на 100-200 р. самаабкладаньня, а сельсаветы і РВК ім нічога не зрабілі. Нічым нельга апраўдаць і мяккасьць, якую праявілі акруговыя ўстановы ў адносінах да працаўнікоў асабліва адсталых РВК: толькі ў апошні час некаторыя загадчыкі фінчастак за зрыў самаабкладаньня атрымалі вымовы.

Між тым, набліжаецца пасеўная кампанія, і кожны тыдзень павялічвае небясьпеку значнага недабору сум самаабкладаньня. Таму неабходны самыя рашучыя меры. Акрвыканкомы павінны жорстка пакараць нядбайных працаўнікоў раёнаў і сельсаветаў.

Навакол збору самаабкладаньня трэба мабілізаваць увагу бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, скарыстаць дапамогу рабочых брыгад, якія зараз працуюць у вёсцы.

М. К.

Злачынная бязьдзейнасьць

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Адным з вузлавых пытаньняў калгаснага будаўніцтва зараз зьяўляецца правільная арганізацыя працы ў калгасах і ўзьняцьцё прапоўнай дысцыпліны на належную вышыню.

Таму партыйныя арганізацыі павінны зараз усю сваю ўвагу зьвярнуць на тое, каб лепш арганізаваць буйную калектыўную гаспадарку, правільна паставіць работу ў ёй, з тым, каб прадукцыйнасьць гэтае гаспадаркі на многа перавышала прадукцыйнасьць індывідуальных гаспадарак.

Магілеўшчына зьяўляецца акругай суцэльнай калектывізацыі. Ужо зараз большасьць акругі ахоплена калгасамі. Таму ў Магілеўшчыне пытаньні правільнай арганізацыі працы ў калгасах набываюць асабліва значэньне, ад гэтага будзе залежаць пасьпяховае правядзеньне веснавое сяўбы і ўсёй сельска-гаспадарчай кампаніі бягучага году.

Што-ж зроблена ў Магілеўшчыне ў гэтым напрамку?

На жаль, прыходзіцца проста сказаць, што зроблена вельмі, вельма мала. Возьмем, напрыклад, вытворчыя пляны калгасаў. Бяз вытворчага пляну калгас, зразумела, ня можа весьці пасьпяховай работы. Магілеўскі-ж акркалгассаюз **нічога ня ведае, што зроблена ў калгасах у галіне распрацоўкі і складаньня вытворчых плянаў. Фактычна да складаньня вытворчых плянаў у калгасах яшчэ не прыступілі, аб гэтым сьведчыць становішча ў калгасах Чырвонапольскага, Чэрыкаўскага і іншых раёнаў Магілеўшчыны.**

Акркалгассаюз дагэтуль нават не пацікавіўся даведацца, што робіцца на гэтым вучастку работы калгасаў.

Вельмі кепска абстаіць таксама з арганізацыяй працы ў калгасах. Кожны калгас працуе як яму хочацца, адзінага пляну працы ў калгасах няма. У акруговым Калгассаюзе гэтым пытаньнем яшчэ не займаліся, думаюць толькі зараз да яго прыступіць. Ня дзіва, што ў калгасах няма пінкага ўліку скарыстаньня рабочае сілы. Ня дзіва, што акркалгассаюз ня ведае таксама і аб формах аплаты калгаснікаў. Калгассаюз праявіў поўную бязьдзейнасьць, ня гледзячы на тое, што веснавая сяўба ўжо набліжаецца.

А. С.

Арганізаванай работай перакагаюць труднасьці

Вёска Камаровічы, Рэчыцкага сельсавету, Чэрыкаўскага раёну, першая пастанавіла арганізаваць калектыў і даць яму імя «Чырвоны Пуцілавец». Дзякуючы энэргічнай рабоце калгасьнікаў, да іх хутка далучыліся Гэінскі, Горкаўскі і інш. сельсаветы. Зусім за кароткі час «Чырвоны Пуцілавец» стаў калгасам гігантам на плошчы ў 70.000 гэкт.

Вёска Камаровічы зараз ідзе першай у галіне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. На 17-га лютага вёскай сабраны 264 тоны насеньня, замест 253 вызначаных плянам. Для хаваньня насеннага фонду камаровіцкія калгасьнікі пабудавалі новыя сьвірны. Пры зборы насеньня захоўваўся клясавы прынцып у адносінах да кожнага калгасьніка.

У вёсцы ўжо скончана пабудова кузьні для рамонту с.-г. інвэнтару. Калгасьнікі ацэнілі хлявы і абагулілі коняй. Калі не хапала цьвікоў, кожны калгасьнік прынёс па 25-30 старых цьвікоў і такім чынам можна было прыступіць да пабудовы стайні.

Камаровіцкія камсамольцы, піянэры і школьнікі актыўна дамагаюць дарослым. Па іх ініцыятыве сабрана 140 пуд. попелу і 90 пуд. другараднага сыру.

Не адстаюць ад камаровіцкіх калгасьнікаў і вёскі Горкаўскага сельсавету. Пасёлак імя Сталіна рапартуе Чэрыкаўскаму райкому партыі:

«Мы абагулілі ўвесь с.-г. інвэнтар, жывёлу, сабралі насенны фонд. Работу праводзім калектыўна. Адпрацавалі тры дні на лесазагатоўках на карысьць трактарнай калёны, запісаліся ўкладчыкамі ашчаднай касы. У часе веснавой сяўбы мы давядзем, што калектыўная арганізаваная працай можна перамагчы ўсе труднасьці, якія стаяць на шляху калектыўнага будаўніцтва.

Брыгадзір «Зьвязды» В. ВОІНАЎ.

Папяровае кіраўніцтва Белкалгасцэнтру

Зусім ненармальная рэч—у нас дагэтуль пінкае ўвагі не зварачалася на арганізацыю працы ў нова арганізаваных калгасах. У нас нейк выпала з-над увагі тая важная акалічнасьць, што буйная калектыўная гаспадарка з вялікаю плошчаю пахаці, з шматлікім жывым і мёртвым інвэнтаром, з рознастайнымі галінамі гаспадаркі—патрабуюць адразу-ж добрую арганізацыю працы.

Зараз мы маем факты, калі многія калгасьнікі і калгасьніцы, абагуліўшы сваю маемасьць, сядзець без працы, ня ведаючы, куды пакіраваць сваю энэргію.

Трэба сказаць, што ў Белкалгасцэнтры пытаньні арганізацыі працы ў калгасах це займаюць патрэбнага месца. Праўда, там складаюцца і рассылаюцца інструкцыі і палажэньні (і то са значным спазьненьнем). Гэтымі папяровымі інструкцыямі ўся справа і абмяжоўваецца. Жывое кіраўніцтва, цляхам выездаў інструктароў, адсутнічае. Рабочыя брыгады, якія выяжджалі ў калгасы, у гэтай галіне зусім ня былі праінструктаваны. Мала таго, тыя шматлікія працаўнікі НКЗ і Калгасцэнтру, якія выяжджалі на месцы для нагляду за правядзеньнем веснавой пасеўнай кампаніі, таксама прайшлі міма пытаньня аб арганізацыі працы ў калгасах.

За той кароткі перыяд часу, які застаўся да веснавой сяўбы, трэба хутчэй прасунуць уперад справу арганізацыі працы ў калгасах. Веснавую сяўбу мы павінны сустрэць арганізацыйна падрыхтаванымі.

Н.

Ліквідаваць агранамічную няпісьменнасьць

Старобінскі раён, Бабруйскай акругі, за апошні час дасягнуў значных посьпехаў у галіне калектывізацыі. У раёне арганізавана 35 калгасаў на плошчы 21.856 гэкт. Калгасамі ахоплена каля 3.000 гаспадарак.

Зараз калгасы рыхтуюцца да веснавое сяўбы, але адсутнасьць спэцыялістых-аграномаў, арганізатараў, перашкаджае рабоце калгасаў. У калгасах няма каму скласьці вытворчых плянаў. У калгасах вызначана вялікае будаўніцтва, але не хапае тэхнікаў. Няма таксама і рахункаводаў. Справа з улікам маемасьці і работы ў калгасах пастаўлена вельмі кепска, калгасьнікі гавораць: «Давайце рахункаводаў, бо калгасы могуць разваліцца».

Гэта высоўвае пытаньне аб неабходнасьці зараз правесьці ў гарадох вярбоўку рахункаводаў для сталай работы ў калгасах.

З другога боку суцэльная калектывізацыя раёну ставіць у парадак дня **ліквідацыю агульнай і агранамічнай няпісьменнасьці сярод калгасьнікаў,** бо бяз гэтага нельга правільна арганізаваць работу ў калгасах, правільна скарыстоўваць людзей, машыны і г. д. Трэба, коб кожны чалавек у калгасе спэцыялізаваўся ў пэўнай галіне.

Рамонтныя майстэрні, якія ёсьць у раёне, не падрыхтаваліся свачасова да рамонту с.-г. інвэнтару калгасьнікаў.

Цікава яшчэ адзначыць, што спажывецкая кааперацыя ў Старобінскім раёне дапамагае разбазарваньню жывёлы. Па раёне разьяжджаюць агенты спажывецкай кааперацыі, якія вядуць сярод сялян агітацыю за разбазарваньне жывёлы. Агенты гавораць сялянам: «Ты, моў, усё роўна ідзеш у калгас, прадавай сваю карову».

Дырэктывы аб забароне скупляць жывёлу ў сельсаветах суцэльнае калектывізацыі спажывецкай кааперацыяй ня выконваюцца.

СКУЦЭНЯ.

НЕ СТАРАЮЦЦА ЗАЦІКАВІЦЬ КАЛГАСЬНІКАЎ РАБОТАЙ

Усякую памылку мясцовых працаўнікоў у галіне арганізацыі вытворчасьці і працы кулак выкарыстоўвае для сваёй агітацыі супроць калектыўнага будаўніцтва. Таму мясцовыя працаўнікі да вырашэньня гэтага пытаньня павінны падыходзіць вельмі ўважліва, не рабіць гэта з наскоку.

У Мазыршчыне рад праўленьняў калгасаў пастанавілі ўсе заработкі калгасьнікаў ад лесазагатовак перадаваць у непадзельны фонд калгасаў. Зразумела, што такая няправільная пастаноўка пытаньня толькі шкодзіць і лесазагатоўкам і калектывізацыі. Гэта прыводзіць да адсутнасьці ўсякай зацікаўленасьці калгасьнікаў у рабоце і да зьніжэньня прадукцыйнасьці працы. Замест 3-4 мэтраў пачалі класьці на воз толькі 1-1 з пал. мэтры дроў.

Абагуленьне жывёлы ў радзе калгасаў Мазыршчыны не замацоўваецца. Часта ў абагуленыя хлявы ставяць 10-15 коняй, у той час, калі ў калгасе ёсьць 200-250 коняй. Рэшта коняй застаецца ў іх былых уласьнікаў. У радзе калгасаў нічога пя робіць для пабудовы новых добрых абагуленых, ацепленых хлявоў. Гэта адбіваецца на пасьпяховай арганізацыі працы і абагуленьні сродкаў вытворчасьці. Між тым на Мазыршчыне, дзе шмат лесу і вольных рук у калгасах, ёсьць усе магчымасьці для пабудовы добрых абагуленых стайняў і абораў.

Мясцовыя-ж працаўнікі замест таго, каб замацаваць абагуленьне рабочай і таварна-прадукцыйнай жывёлы, пачынаюць абагульваць курэй і інш. дробную жывёлу.

Частку віны за дрэнную пастаноўку вытворчасьці працы ў калгасах трэба ўскласьці і на раённыя арганізацыі, якія ня кіруюць работай калгасаў.

Брыгадзіры «Зьвязды» М. ЛАЎКЕТ і А. ШАФРОНАК.

Закрылася канфэрэнцыя Фрунзаўскага раёну

23-га лютага закрылася канфэрэнцыя ударнікаў Фрунзаўскага райкому. Апошняе пасяджэньне было прысьвечана спрэчкам па дакладах т. т. Гея і Грысэвіча. У спрэчках выказалася звыш 12 чалавек.

Канфэрэнцыя ўдарнікаў бурнымі воплескамі спаткала прадстаўніка Чырвонай армії, камандзіра 6 палка т. Копьёва.

Ад імя чырвонаармейцаў - ударнікаў канфэрэнцыю вітаў чырвонаармеец тав. Хмяльніцкі.

Канфэрэнцыя ўдарнікаў прыняла прапанову аб прэміраваньні лепшых чырвонаармейцаў № палка, якія пакажуць слёзе прыкладнымі ў часе ўдарніцтва.

Рад таварышоў, якія выступалі ў спрэчках, зазначалі на адмоўныя бакі кіраўніцтва ўдарнікамі.

Рабочы Гэрман (завод «Дрэваапрацоўшчык») паказвае на адсутнасьць на заводзе пяцігадовага пляну.

— Рад прарываў — кажа тав. Хэйман —быў на фабрыцы «Кастрычнік». А гэта здарылася таму, што ня было правільнага разьмеркаваньня рабочай сілы.

Рабочы рымарнай фабрыкі т. Кантаровіч кажа, што прамфінплян недавыкананы на 42 проц. Працыдысцыпліна не павышаецца. Фабрыка дрэнна забясьпечваецца сырцом. Рабочыя ня ведаюць аб прамфінпляне.

Тав. Л. Гурэвіч падкрэсьлівае, што нізавыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі вельмі мала зрабілі, каб практычна дапамагчы рабочым - калгасьнікам.

У сваім выступленьні тав. Рыжоў паказвае, што спасылацца на «абъектыўныя» прычыны ў сэнсе невыкананьня прамфінпляну ні ў якім разе нельга. Тыя промахі, якія мелі месца з невыкананьнем прамфінпляну ў першым квартале, павінны быць ліквідаваны, і прамфінплян трэба выканаць з перавышэньнем. Той толькі завод або фабрыка будуць пічыцца ўдарнымі, калі яны выканаюць і перавыканаюць прамфінплян, дадуць добрай якасьці прадукцыю, зьніжаць сабекошт яе, зьнішчаць на ўсе сто процантаў прагулы.

У канцы канфэрэнцыя ўдарнікаў заслухала заключнае слова т. т. Гэя і Грысэвіча.

Б—н.

Архітэктары -- ударнікі

Рэдакцыя газэты «Зьвязда» атрымала ліст ад архітэктараў Белжылсаюзу т. т. ВАЛОДЗЬКІ, ВОІНАВА, КРЫЛОВА і ГІЛЯРАВА, у якім яны заяўляюць:

— Бяручы пад увагу неабходнасьць шпаркага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва—выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, і лічачы, што інжынэрна тэхнічныя работнікі не павінны стаяць у баку ад вялізарных тэмпаў будаўніцтва сацыялізму, абвяшчаем сябе ўдарнікамі і ставім перад сабою наступныя задачы:

— ПАСКОРЫЦЬ ВЫПУСК ПРАЕКТАЎ СУПРОЦЬ ВЫЗНАЧАНЫХ ТЭРМІНАЎ, ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ СКЛАДЗЕНЫХ ПРАЕКТАЎ І ПРАВЕСЬЦІ Ў ЖЫЦЬЦЁ ДЫРЭКТЫВУ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ ЗНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ БУДАЎНІЦТВА.

Не дапусьцім перагібаў, якія закранаюць серадняка
Ударым па прымірэнчых адносінах да кулака

„Растлумачальная" работа пятрыкоўскіх працаўнікоў

Рад вестак, атрыманых намі гаворыць аб тым, што паасобныя мясцовыя раённыя і сельсавецкія працаўнікі Мазыршчыны дапускаюць рад палітычных памылак пры правядзеньні калектывізацыі і арганізацыі вытворчасьці ў калгасах. Гэтым часта карыстаюцца кулакі, каб, пры дапамозе сваіх агентаў, разбурць калгасы з сярэдзіны, дэзарганізаваць іх работу.

Напрыклад, у **Пятрыкоўскім** раёне ў радзе сельсаветаў мясцовыя работнікі пры арганізацыі працы ў калгасах ужываюць адміністрацыйныя меры замест добрай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў. Гэта выклікае часта сярод апошніх абурэньне і шкодзіць калгаснаму будаўніцтву.

У вёсцы Ляскавічы, Пятрыкоўскага раёну, адбываўся сход калгасьнікаў, на якім старшыня Брынёўскага калгаснага куставога аб'яднаньня, член партыі Жыткевіч, замест растлумачальнай работы, рэзка паставіў перад калгасьнікамі пытаньне аб патрэбнасьці абагуліць зараз-жа, на працягу трох дзён, усё насеньне, рабочую і малочную жывёлу і выехаць на лесазагатоўкі.

Куставое аб'яднаньне дагэтуль амаль **нічога не рабіла** ў галіне арганізацыі працы ў калгасе і абагуленьня маемасьці, а цяпер старшыня праўленьня Жыткевіч адным росчаркам пяра загадвае правесьці абагуленьне.

Калі некаторыя калгасьнікі выступалі з прапановамі правесьці падрыхтоўчую і арганізацыйную работу, іх называлі падкулачнікамі і кулакамі.

Па запытаньне аднаго з калгасьнікаў, як будуць у калгасе разьмяркоўвацца прадукты, Жыткевіч замест таго, каб растлумачыць прынцыпы вызьдзельчыны, даў адказ:

«Добрым калгасьнікам дамо мяса, а дрэнным атрымаюць зацірку і бурду».

Пасьля такіх «адказаў» мясцовага кіраўніка, настрой сярод калгасьнікаў яўна пагоршыўся. Былі выпадкі, калі паасобныя калгасьнікі, пад уплывам кулацкай агітацыі, падавалі заявы аб выхадзе з калгасу.

У вёсцы Гліняцкага сельсавету вельмі няўдала пачалі праводзіць абагуленьне малочнае жывёлы. Сярод жанчын ня было праведзена ніякай растлумачальнай работы. Рад жанчын-калгасьніц папрасілі прадстаўніка РВК т. Карачэўскага правесьці з імі гутарку аб калектывізацыі і арганізацыі працы ў калгасе, але Карачэўскі адмовіўся.

Зразумела, што такія паводзіны мясцовых працаўнікоў толькі шкодзяць калектывізацыі. Калгасьнікі ў новых умовах сустракаюцца зараз з радам пытаньняў, якіх яны самі ня могуць вырашыць. Замест таго, каб дапамагчы ім, мясцовыя працаўнікі, як мы гэта бачым на прыкладзе Пятрыкоўскага раёну, займаюцца адміністраваньнем.

П.

Адміністраваньне на руку клясаваму ворагу

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Круглянскі раён зьяўляецца раёнам суцэльнае калектывізацыі. Каля 70 проц. гаспадарак раёну ўступілі ў калгасы. Побач з гэтым у раёне ёсьць некаторыя, якія яшчэ не ўступілі ў калгасы. Тлумачыцца гэта тым, што беднякі і сераднякі гэтых вёсак не знаёмы з мэтамі і сутнасьцю калектывізацыі, з работай і жыцьцём у калгасах. Аднак, паасобныя мясцовыя працаўнікі замест растлумачальнай работы ўжываюць адміністрацыйныя мэтады.

У паасобных вёсках Круглянскага раёну часамі за кулаком не заўважаюць серадняка і раскулачваюць яго. Так, у Скуратаўскім сельсавеце ў в. Хацкевічы раскулачылі серадняка, якога сельсавет няправільна апататкаваў у індывідуальным парадку. Гэты серадняк мае аднаго каня, адну карову і сям'ю з 10 едакоў. Такіх фактаў у Скуратаўскім сельсавеце, дзе старшынёй зьяўляецца Пальчэўскі, ёсьць ня мала. Цікава пры гэтым Пальчэўскі дае магчымасьць кулаком разбазарваць жывёлу і інш. маемасьць, каб потым пралезьці ў калгас. Так, член сельсавету Камінскі, які мае 14 дзесяцін зямлі, 2 коняй, 3 каровы, 15 вуляёў пчол і трымаў двух батракоў, амаль зусім не плаціў падатку. Зараз, распрадаўшы ўсю сваю маемасьць, ён уступіў у калгас. Пальчэўскі аб гэтым добра ведаў, але маўчаў.

У Аршанскім і Талачынскім раёнах быў дапушчан рад скрыўленьняў у адносінах серадняка пры праверцы індывідуальна абкладзеных гаспадарак. Зараз там прыходзіцца аслабяняць ад індывідуальнага падатку каля 30 проц. няправільна абкладзеных серадняцкіх гаспадарак.

Бедната ў гэтых раёнах таксама неарганізавана. Ніякай работы сярод яе не вядзецца. Раскулачваньне кулацкіх гаспадарак праходзіла бяз удзелу беднякоў і сераднякоў, а выключна ў адміністрацыйным парадку.

Адказныя раённыя працаўнікі, якія прыбылі ў Круглянскі раён, амаль зусім не наведваюць вёскі, а ўсё сядзяць у раёне і таму ня ведаюць, што робіцца на вёсцы. Працаўнік з акругі Гаранок, які прыехаў у Скуратаўскі сельсавет, ня толькі нічога не зрабіў, каб выправіць памылкі, дапушчаныя старшынёй сельсавету Пальчэўскім, а наадварот дапамагаў яшчэ яму ў гэтым.

А. М.

Барацьба за Чырвоны Менск

Гісторыя барацьбы Чырвонай армії за Менск зьяўляецца буйным гістарычным эпізодам грамадзянскай вайны в беларускіх, дае гэроізм і выключная стойкасьць Чырвонае армії знайшлі сваё закончанае яскравае адлюстраваньне.

Барацьба за чырвоны Менск—сталіцу Савецкай Беларусі — адна са слаўных старонак гэраічнай барацьбы Рэспублікі Саветаў з панскай Польшчай.

Ліпень 1920 году. Нашы часьці, фарсаваўшы Бярэзіну, моцным ударам адкінулі беларускія дывізіі на Менску. Наш №-скі Волскі полк наступае на флянг польскай групе, якая адступала з Барысава на Смалявічы. Палякі хочуць выйграць час, каб прыбраць са ст. Вітгэнштэйнская эшалёны, грузы і захаваць шляхі адыходу на Менск. для яго абароны. Пад Смалявічамі завязаўся першы гарачы бой палка з часьцямі польскай дывізіі. Нашы суседзі адстаюць. Палякі заадна, з выключнай упартасьцю абараняюцца, ведаючы, што вырашэньне яго Менску і адстаўшай польскай групы войск. Не пералічыць колькасьці атак і контр-атак з абодвых бакоў, ня забывалася на кожным кроку, ля кожнага куста. Сьмерцю адважных адзін за адным палаюць камандіры і чырвоныя армейцы. Камроты Крапачоў са жаўнерамі такіх-жа, як і ён, адважных кідаецца ў атаку на бронэшлянік і гіне, а з ім тыя, чые імёны застаюцца невядомымі для гісторыі.

Мястэчка Смалявічы і ст. Вітгэнштэйн скала заняты польская група разьбіта. Злучыўшы свае перадавыя валы, полк накіраваўся на Менск. Ледзь толькі пачало сьвітаць на дарозе на Менск полк расьцягнецца направа і налева. Наперадзе нарастае страляніна. Гэта наша першая разьведка ўжо б'ецца з палякамі. Сьцінаемся разгарнуцца і ўдарыць. Цяжка цягнуць кулямёты, хочацца піць... Наперадзе дротавыя загародкі і акопы, а ў іх палякі. Градам куль і шрапнэлью спаткалі нас палякі. Падаюць таварышы..., але хутчэй, хутчэй наперад... Вось і дрот. «Даеш Менск», «Даеш Варшаву» і нястрымная лавай нашы байцы, літаральна рукамі разрываючы дротавыя загародкі, з налётам прабіваюць умацаваньні. Вораг ня ўтрыманы ў сабе, прыціскаецца да зямлі, баіцца адарвацца ад яе і адстрэльваецца. Вось і акопы... «Ура»—заглушае трэс кулямётаў і выбухі знаряддаў... Палякі ўцякаюць. Наперадзе Менск. які выступае з раніцняга туману. Палякі ўцякаюць у напрамку гораду.

За тры кільмэтры ад гораду ў лесе знаходзіўся польскі батальён. Чырвоныя хутка не чакалі, становішча на ня ведаюць. Са ста крокаў мы ў атаку і зьмешаны батальён а часткаю адаецца. Вось і у бясьсільнай злосьці вораг, зягны, руйнуе масты, паліць склады і станцыю. Трэба спыняцца. Ад хуткага бегу з кулямётамі мучыць смага, сэрца гатова разарвацца, побач бягуць два параненыя кулямётчыкі, якія катэгарычна адмовіліся выйсьці са строю.. Горад трэба выратоўваць ад разьбуральнага ворага. Ля станцыі невялікія часьці палякаў страляюць. Наперад! Часьці рынуліся на ворага, захватваюць яго і заварочваюць у горад. На вуліцах рабочыя і жыхары ралясна сустракаюць чырвонаармейцаў. Да мяне падыходзіць стары яўрэй з крывавой павязкай на выразе, намагаецца нешта сказаць і ня можа ад болю. Ад гэтага яшчэ больш праз павязку выступае кроў. Іншыя растлумачваюць, што ў яго польскі салдат і ўпер вырвалі кавалак барады, бо ён «яўрэй». Побач плачуць старая і два падросткі. З намі хочуць гаварыць, але няма часу, трэба ісьці далей ва Менск.

Менск наш! Менск савецкі!

Аб гэтым гавораць твары, чырвоныя сьцягі, чырвоныя хустачкі, «Інтэрнацыянал», мітынгі, але ўсё гэта, як і сам горад, застаецца ззаду.

Наперадзе вораг і... Варшава...

Выпрабаваньне ня скончана, перамога яшчэ не замацавана. У верасьні пад Койданавым ідуць ніжкія баі, нябывалыя па сваёй упартасьці. Менск у небясьпецы. У нас загад. абаранять Менск да апошняй кроплі крыві. Б'ецца за Койданава вось ужо трэція суткі. У ворага тут больш сілы. Трымаемся. Прарыў зьлева, вораг заходзіць у тыл і ўрываецца ў неабаронены горад. Сьпяўшы зубы, выходзім з пазыцыі пад Койданавым. Ідзем у Менск. Трэба прабівацца ва што-б там ні стала і заняць Менск. Падыходзім да гораду—нікога. У горадзе ўсе хаваюцца, адчуваецца набліжэньне навальніцы. Праходзіць вакоўцу, захоўваючы цішыню. Падыходзіць вечар. З вузенькага завулку затрашчаў кулямёт і сьвішчуць струмэнь пачаў заліваць полк. На вузенькіх вуліцах завязалася рукапашная схватка. Полк трапіў у засаду. Штыкамі і прыкладамі прабілі дарогу з горада. Пад раніцу падрыхтаваліся атакаваць Менск. Загад: у зьвязку з перамогай спыніць ваенныя дзеяньні. Менск праз дзень мы занялі зноў.

Ужо зраўняліся з зямлёю магілы гэроў, што загінулі пад Менскам, але не забыта іх справа, іх імёны імёны тых, што крывёю сваёй палілі і ўсьцілалі касьцямі шлях палі Беларусі, аб'ядналіся ў адно—непераможную Рабоча - Сялянскую Чырвоную армію, узброеную апору пралетарскай дыктатуры, першы атрад сусьветнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії.

Сёньня ёй 12 год, 12 год змаганьня і перамог.

КРАСКАДАЛЬСКІ.

13-ы год Чырвонае коньніцы

Наша грамадзянская вайна ўвойдзе ў гісторыю коньніцы, як пачатак эпохі адраджэньня гэтага роду войск. Коньніца, да канца імпэрыялістычнае вайны адыгрывала на задні плян у агульнай сыстэме ўзброеных сіл, у грамадзянскую вайну рэзка высунулася на адно з першых месц. Недарма Пілсудзкі, у сваёй працы «1920 год» піша аб тым патрасёны ўсёй польскай дзяржавы, якое выклікалі магутныя ўдары 1-е коннае арміі, якая зараз сьвяткуе сваё дзесяцігодзьдзе.

Прычыны адраджэньня коньніцы на палёх грамадзянскае вайны ляжаць ня толькі ў характары нашага тэатру ваенных дзеяньняў — яго абшары і малой культурнасьці — і ў слабым насычэньні фронту жывой сілай і тэхнікай. Адной з асноўных прычын зьяўляецца клясавы характар нашае вайны. Іменна гэтыя абставіны і даюць падставу лічыць, што і ў будучай вайне, ня гледзячы на павялічэньне шчыльнасьці фронту і тэхнікі, Чырвоная коньніца прадстаіць адыгрываць самастойныя і адказнейшыя ролі на тэатры ваенных дзеяньняў.

Перш за ўсё, рэвалюцыйны клясавы характар вайны нямінуча робіць гэту вайну манёўранаю; «фронт» мае меншую ўдзельную вагу, чым «ачаг» барацьбы, барацьба ідзе больш за «жыцьцёвыя і мёртвыя раёны», чым за рубяжы. Гэта патрабуе вялікае колькасьці перасоўнага войска, а ва ўмовах нашага тэатру сярод іх на першым месцы стаіць коньніца.

Падругое, чырвоная коньніца асабліва рэзка адрозьніваецца ад усіх іншых «коньніц» — і ў гэтым карэньні яе сілы. Ва ўсіх буржуазных арміях коньніца прадстаўляе сабою самы рэакцыйны, самы кансэрватыўны род войска. Прычынаю гэтага зьяўляецца, папершае, тое, што асноўны элемэнт коньніцы, як роду войска — конь — па сваёй прыродзе амаль не зьмяняецца і, значыцца, ня падштурхвае кавалерыйскае думкі да прагрэсу. Коньніца заўсёды была рыцарскім родам войска; камсклад коньніцы ўсюды і заўсёды камплектаваўся пераважна са шляхецтва, самае кансэрватыўнае клясы па сваёй клясавай сутнасьці. Таму коньніца, некалі пануючая на палёх боек, упарта трымаючыся за былыя традыцыі, чым далей, тым больш адрывалася ад жыцьця і да канца імпэрыялістычнае вайны аказалася амаль бескарыснаю. У выніку, ня маючы магчымасьці ажыцьвіць коньніцу, буржуазія ставіць пытаньне аб нератаваньні яе ў сьвядзячую пяхоту.

Пралетарская Чырвоная коньніца стварылася на іншай клясавай аснове.

Роданачальнікамі чырвоных кавалерыйскіх палкоў былі рэвалюцыйны партызанскія атрады; яе правадыры вышлі з радоў рэвалюцыйнага аванграду рабочае клясы, батрацтва і бяднякога сялянства. Гэтага было даволі, каб Чырвоная коньніца адмяла мішуру «рыцарскіх конных традыцый» і стварыла новы тып коньніцы, коньніцы с праўднай, але сучаснай.

У чым сутнасьць Чырвонае коньніцы, як роду войска? Створаная з-рабоча - сялянскага цеста, прасякнутая рэвалюцыйна - клясавай сьвядомасьцю, кіруемая перадавымі байцамі - камуністымі, Чырвоная коньніца брала і бярэ ад сучаснае тэхнікі ўсё, што яе зьяўляе яе рухавасьці, дае ёй узмацненьне самастойнасьці і прабіўное сілы.

Мэты і характар рэвалюцыйнай клясавай вайны патрабуюць рухавых і моцных конных мас; і Чырвоная коньніца ня зьвязаная ніякімі прафэсыянальнымі традыцыямі мінулага, бярэ агнявы сродкі, робіцца першым прыяцелем матора і застаючыся коньніцаю, перастае з асобнага роду войска ў асобны элемэнт сухаземнае ўзброенае сілы — у агульнавайсковым злучэньні конных мас.

Індустрыялізацыя краю і калектывізацыя сельскае гаспадаркі адкрываюць нячуваныя магчымасьці ўзмацненьня Чырвонае коньніцы. Яна атрымлівае новую магутную тэхніку, якая забясьпечвае ёй вялізарны прырост прабіўнае сілы і рухавасьці; калгасы дазволяць пашырыць і ўзмацніць тэрсыстэму, дадуць Чырвонай коньніцы зусім адмеўнага, сьвядомага, клясава - вытрыманага байца і добрага баявога каня. Перад Чырвонай коньніцай, якая ўжо даказала у мінулай грамадзянскай вайне сваю карысьць, адкрываюцца новыя шляхі і магчымасьці.

Хто ня бачыць гэтага — не разуме характару будучай вайны, не адчувае размаху нашых ваенна - палітычных задач, ня бачыць прагрэсіўнае ліквідацыі апэратыўнага замыслу арміі пралетарскае рэвалюцыі.

Хто бачыць і разумее задачы нашае Чырвонае коньніцы, той павінен разумець і трудасьці ў кіраўніцтве гэтым магутным, але складаным сродкам РСЧА і з асаблівай энэргіяй узяцца марудную, чарнавую работу, каб у сваёй дзённай працы мірнае перадышкі выкоўваць заруку перамог у грозных дні вайны за сацыялізм.

Б. ВЕРХАЎСКОЙ.

Сьвята 12-й гадавіны РСЧА

Пад знакам непарыўнай сувязі

(У дні сьвята у Менску)

Непрэддадні сьвята па ўсіх прафсаюзах склікаліся спэцыяльныя нарады культаддзелаў сумесна з прадстаўнікамі Чырвонае арміі, на якіх былі распрацаваны пляны сьвяткаваньня.

Па цэхах на прадпрыемствах і ва ўстановах вялася з рабочымі і служачымі гутаркі аб 12-й гадавіне Чырвонай арміі.

На сумесных вечарох паміж чырвонаармейцамі і шэфарганізацыямі ПАДПІСВАЛІСЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ДАГАВАРЫ.

Амаль усе саюзы абсталявалі чырвоныя куткі ў сваіх падшэфных вайсковых часьцях. САЮЗ ДРУКАРОЎ адпусьціў спэцыяльныя сродкі для абсталяваньня чырвонаармейскага клюбу падшэфнага палка.

У клюбе друкароў была наладжана выстаўка вайсковае літаратуры, вылешаны сьпісы вайсковых кніг, якія рэкамэндуецца набыць членам саюзу.

ТРАНСПАРТНІКІ наладзілі сумесны абед рабочых з чырвонаармейцамі, далі чырвонаармейцам бібліятэчку з 160 кніг і абмяняліся насьценгазэтамі.

Рабочыя ШЧОТАЧНАЕ Ф-КІ падаравалі падшэфнай вайсковай часьці інструменты для струннага аркэстру. РАБОЧЫЯ - ГАРБАРЫ ПАДПІСАЛІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР З ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМІ.

Добра было праведзена сьвяткаваньне і сярод АСЬВЕТНІКАЎ, якія закупілі для падшэфных вайсковых часьцей шмат рознае літаратуры.

ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКІ ў часе сьвяткаваньня 12-й гадавіны наладзілі лыжныя спаборніцтвы з чырвонаармей

Месячнік ашчаднасьці

Бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый зрывае посьпех кампаніі

Месячнік амаль ня вышаў за межы габінэтаў

На апошнім пасяджэньні цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту быў заслуханы даклад **Мазырскай акруговай камісіі садзейнасьці** аб правядзеньні месячніка ашчаднасьці.

Мазырская камісія амаль нічога не зрабіла для правядзеньня месячніка. Зусім не мабілізавала ўвагі працоўных мас вакол ашчаднае справы.

Цэнтральная камісія абвясьціла Мазырскай акруговай камісіі вымову з папярэджаньнем.

Прадстаўнік першага раёну суцэльнае калектывізацыі **Клімаўшчыны** зрабіў даклад аб тым, як праходзіць месячнік у Клімавіцкім раёне.

Клімавіцкія ашчадкасы нічога ня робяць для правядзеньня месячніка. Кампанія пачала праводзіцца толькі тыдзень назад. За апошні час наглядаецца сыстэматычны адліў укладаў. Прафарганізацыі не дапамагаюць месячніку ашчаднасьці. У сельскіх мясцовасьцях няма амаль ніякіх выпікаў месячніка.

Тав. Калодка (ЦСПСБ) у сваёй інфармацыі аб удзеле саюзаў у месячніку нічога канкрэтнага ня мог сказаць. Была паслана брыгада, каб праверыць ход месячніка, але ніякіх вестак аб ёй няма.

ЦСПСБ наогул ня ведае, як ідзе работа на пэрыфэрыі.

Прадстаўнікі маскоўскае рабочае брыгады і старшыня цэнтральнай камісіі тав. Хацкевіч адзначылі, што прафарганізацыі вельмі слаба праводзілі кампанію, што ніякая агітацыя за месячнік не праводзілася.

У Віцебску на некаторых заводах зусім ня ведаюць аб месячніку; на заводзе «Энэргія» старшыня заўкому лічыць, што гэтай справай ня варта займацца; прафарганізацыі саюзу гарбароў лічаць, што спачатку трэба пакончыць з іншымі кампаніямі, а потым узяцца за месячнік.

У заключэньне цэнтральнай камісіяй быў заслухан даклад галоўнага кіраўніцтва ашчадкасамі.

Цэнтральная камісія намеціла рад мер, каб разгарнуць месячнік ашчаднасьці.

Ц.

На мёртвым пункце

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Месячнік ашчаднасьці па Бабруйшчыне праходзіць вельмі дрэнна. Першая дэкада лютага дала нават адліў укладаў на 6.000 руб. У другой дэкадзе лютага справа крыху палепшылася. Ёсьць рост укладаў на суму каля 40.000 руб., але ён—мізэрны ў параўнаньні з кантрольнай лічбай месячніка (390.000).

Слаба праходзіць месячнік у раёнах. Жлобінскі раён мае 434 руб. новых укладаў, у той час, калі заданьне складае звыш 35.000 руб.

Бабруйск, які павінен быў даць новых укладаў на суму 52.000 руб., выканаў пакуль што толькі 28,2 проц. заданьня.

З такімі тэмпамі далёка не заедзеш

ЧЭРЫКАЎ. (Наш кар.). Месячнік ашчаднасьці ў раёне не адчуваецца. Мясцовыя прафэсыянальныя арганізацыі нічога ня робяць, каб папулярызаваць месячнік сярод мас працоўных. Раённая камісія садзейнасьці амаль не дапамагае правядзеньню кампаніі.

Камісія па правядзеньні месячніка дагэтуль ніяк ня можа сабрацца—прыходзіцца працаваць аднаму старшыні.

Калі на вёску выяжджалі брыгады для правядзеньня перавыбараў саветаў, дык на нарадзе гэтых брыгад ня было нават пастаўлена пытаньне аб тым, как брыгадзіры дапамаглі правядзеньню месячніка ашчаднасьці. Старшыня нарады зьняў гэтае пытаньне з парадку дня.

М—ка.

Бяз удзелу савецкай грамадзкасьці

(Рапарт рабочай брыгады)

Рабочая брыгада азнаёмілася з ходам месячніка ашчаднасьці на Бабруйшчыне. Устаноўлена, што практычная работа на акрузе, як сьлед, не разгорнута.

Прэзыдыум АВК, які павінен быў прыняць актыўны ўдзел у разгортваньні кампаніі, тры дні марнаваў пад сукном пляны і кантрольныя лічбы месячніка.

Трэба таксама адзначыць, што ў пастанове **гаркому КП(б)Б і акруговай камісіі** садзейнасьці дзяржкрэдыту, слабы прыцёк укладчыкаў тлумачыцца дрэнай работай ашчадных кас. Установуча адразу-ж была ўзята выключна на апарат, без прыцягненьня грамадзкасьці да практычнай работы, што зьяўляецца вялікай памылкай.

Слабы ўдзел прымае ў месячніку і бабруйская газэта «Камуніст». Газэта не стварыла грамадзкае думкі наўкола месячніка. Матар'ял аб гэтай кампаніі часта марнуецца пад сукном, чакаючы чаргі. Слаба разгарнула работу і акруговая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту. Так, **старшыня камісіі нічога ня ведае, як выконваюцца кантрольныя лічбы і зусім ня цікавіцца ходам кампаніі па раёнах.**

На пасяджэньнях камісіі садзейнасьці старшыня яе, замест канкрэтных прапаноў па правядзеньні месячніка, займаецца агульнымі разважаньнямі, якія ня маюць ніякага практычнага значэньня ў ходзе работы.

Уся камісія садзейнасьці складаецца выключна з ведамственых прадстаўнікоў і працуе толькі апаратным спосабам, рабочыя-ж бабруйскіх прадпрыемстваў у працу камісіі зусім ня ўцягну ты.

Ня могуць таксама пахваліцца сваёй работай і прафсаюзныя арганізацыі. Яны прымаюць вельмі слабы ўдзел у правядзеньні месячніка ашчаднасьці.

Ня ўцягнуты ў работу і насьценгазэты бабруйскіх прадпрыемстваў. Яны на сваіх старонках зусім не асьвятляюць ходу кампаніі месячніка сярод рабочых.

Хроніка

Радыёфікацыя калгасаў. Акруговая інспэкцыя асьветы прыступіла да радыёфікацыі раду калгасаў Менчыны. У першую чаргу гучнагаварыцелі будуць устаноўлены ў 4-х калгасах.

На бесьперапынку. Швэйная фабрыка «Прафінтэрн» у Віцебску пераходзіць з 1-га сакавіка на бесьперапынку.

Перавыбары фабкомаў. 20-га лютага па прадпрыемствах паперовай прамысловасьці Беларусі пачаліся перавыбары фабзаўмясцкомаў. Перавыбары скончацца да 15-га красавіка.

Праверка падрыхтоўкі да будаўніцтва. Фабрыкі паперы «Гэрой Працы», «Спартак», «Чырвоная Зорка» і імя Сталіна арганізуюць ударныя брыгады для праверкі падрыхтоўкі Белпапертрэсту да надыходзячага будаўнічага сэзону.

Пастаўка на адкорм сьвіней. Пры Менскай акруговай інспэкцыі акрагандлю адбылася нарада, на якой прынята пастанова аб засадцы ў калгасах акругі да 1-га кастрычніка на адкорм 14.700 сьвіней, што дасьць каля 2.000 тон сала і мяса.

У Белдзяржкіно

— Ударная група фабрыкі Белдзяржкіно ў складзе рэжысэра Дзігана, апэратара Наумава і памочніка апэратара Рагачэўскага выехала ў Магілеўскую акругу суцэльнай калектывізацыі для здымкі дакумантальнага фільму «Узьні майся Беларусь».

Група здыме жыцьцё калгасьнікаў у перыяд падрыхтоўкі да веснавое сяўбы. Асноўная ўвага будзе аддана пытаньням клясавай барацьбы на вёсцы, арганізацыі працы і быту ў калгасах.

На фабрыцы Белдзяржкіно, па сцэнарыі Леанідава, скончана фільма «Саша»; рэжысэр Аляксандра Хахлова.

Фільма паказвае дапамогу арганізаванага калектыву цёмнай жанчыне на вёсцы.

Усебеларускі зьезд КСУ

Вячэрняе пасяджэньне Усебеларускага зьезду КСУ 23-га лютага было прысьвечана справаздачы ЦК КСУ.

Дакладчык т. Жарын падрабязна спыніўся на ўсіх галінах работы ЦК.

Учора раніцай адбываліся спрэчкі па дакладу т. Жарына.

Дэлегаты зьезду гутараць з сакратаром ЦВК БССР

27-га лютага ў 18 з пал. гадз. у **Доме Камасьветы** адбудзецца вечар парт. і кам. актыву навучальных ячэек г. Менску.

Парадак дня: 1) Даклад Наркамасьветы т. **Платуна** на тэму: «Праблема падрыхтоўкі кадраў і задачы партработы навучальных ячэек». 2) Канцэрт сымфанічнага аркестру Белрадыёцэнтру. 3) Кіно-фільм.

Білеты разданы па ячэйках.

26-га лютага, а 6-й гадз. увеч. у клюбе мэталістых (Універсытэцкая вул.) адкрываецца раённая канфэрэнцыя ўдарнікаў, якую склікае ЦСПСБ сумесна з Кастрычніцкім райкомам КП(б)Б.

Парадак дня:

1. Чарговыя задачы рабочае клясы.
2. Выкананьне пляну на першы кв. 1929-30 г. і далейшая работа ўдарнікаў.

Мандаты выдаюцца па сьпісах, абавязкова засьведчаных фабзаўмясцкомамі 25-га лютага ад 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня і ад 6—8 гадз. увечары ў агульнай канцылярыі ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх) 26-га—ад 9—4 гадз. дня там-жа і ад 5 гадз. да пачатку канфэрэнцыі ў клюбе мэталістых.

АРГ. КАМІСІЯ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ЦКК-РСІ зацьвердзіла наступны склад камісіі па чыстцы апарату Наркамфіну БССР:

Лубуж—Эпштэйн—Верба (ад ЦКК-РСІ).

Панкевіч—Элькінд (рабочыя заводу «Энэргія»).

Бунін—ад адміністрацыі Наркамфіну.

Рашчынскі—ад М. К. Наркамфіну.

Старшыня—т. Лубуж—член прэз. ЦКК.

Чыстка Наркамфіну пачынаецца ў бліжэйшыя дні.

Заявы і матар'ялы на асобных працаўнікоў НКФ просьба накіроўваць у НК РСІ, камісіі па чыстцы Наркамфіну.

27-га лютага, у 18 гадз. увеч. у залі Менскага акруговага суду (вул. Карла Маркса, 5, 3-ці паверх) пачнецца чыстка калектыву абаронцаў.

Камісія па чыстцы просіць усіх працоўных прыняць актыўны ўдзел у ле працы.

СЕНЬНЯ

БДУ. Агульны сход студэнтаў і навуковых працаўнікоў праўрасу БДУ.

Парадак дня: аб становішчы акадэм. працы і рэарганізацыя факультэту (даклад. т. т. **Вольфсон і Ізнаплін**). Правакі зьбіраюцца ў 41 аўд. знанамістыя—у актавай залі. Пач. у 17 гадз.

Дом Асьветы. Кіно для членаў клюбу «Пяць у яблычка».

Дом Асьветы. Сход ударнікаў асьветнікаў. Пач. а 19 гадз.

Інстытут аховы працы. У памяшканні інстытуту адбудуцца заняткі адміністрацыйнага цыклю курсаў рацыяналізатараў. Будуць разданы практычныя заданьні. Пач. у 18 гадз.

БелМБІТ. Пасяджэньне Бел. аддз. Усесаюз. Энэргет. камітэту, на якім будзе заслухан даклад інжынэра **Каржанеўскага** на тэму: «Перспэктыва забесьпячэньня апаратам БССР на бліжэйшыя 10 год». Уваход вольны.

Дом Камасьветы. У 19 гадзін група антырэлігійная кансультацыя—у пакоі № 23.

ЗАЎТРА

Дом Камасьветы. У 19 гадз. кансультацыя т. **Гальдштэйна** для кіраўнікоў ленінскіх груп на тэму: «Задачы партыі ў галіне прамысловасьці» (пакой № 19).

Сход асьпірантаў БДУ пераносіцца з 26-га на 27-га лютага. Пач. у 19 гадз. Пакой № 17 мэдкорпусу.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Клюб саўгандальслужачых. На 19 гадзі. склікаецца 3-я група Фрунз. раённага далегацкага сходу. У гэты-ж дзень і гадзіну склікаецца першая група далегацкага сходу ў клюбе працасьветы. Яўка абавязкова.

БДУ. Сход асьпірантаў сэмінару т. Выдры ў габінэце нам. рэктара—у 18 гадз.

Дом Чырвонай арміі. 28-га лютага, у 19 гадз.—агульны сход членаў ДЧА па перавыбарах праўленьня дому.

Перарэгістрацыя членаў Дому Чырвонай арміі працягнута да 5-га сакавіка. Таварышы, якія не зарэгіструюцца да гэтага тэрміну, мэханічна выбываюць з членаў ДЧА.

Кастрычніцкі райком КП(б)Б просіць усіх таварышоў і ўстановы, якія ведаюць месцазнаходжаньне партыйца-брыгадзіра тав. Сямёнава, паведаміць у Менск—Кастрычніцкаму райкому.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Фэльетон

„Флірт бухгальтароў"

На гэты раз павесяліць сваіх падначаленых з акруговых гарадоў выпала на долю начальніка і галоўбуха адной рэспубліканскай установы.

Галоўбух гэтае ўстановы склаў гэніяльны твор. Гэты твор запаліў вясельлем сэрцы акруговых работнікаў. Твор носіць скромную назву: «Агляд становішча вучоты». Гэта назва ніякай падазронасьці не выклікае. Наадварот — улівае нейкую бадзёрасьць і гордасьць.

На зусім іншую думку наводзяць назвы частак гэтага твору: частка 1-я **«Запытаньні»**, частка 2-я **«Адказы»**. Нешта занадта знаёмае! Ага! успамінаецца: калі гуляюць у флірт кветак ці багоў — таксама даюць запытаньні аднай карткай і атрымліваюць адказ гэтай самай ці іншай карткай. Зьяўляецца падазронасьць ці не запазычыў аўтар гэтага твору свой зьмест з картак флірту кветак і багоў. Знаёмімся са зьместам твору. Адлегла трохі ад сэрца: зьмест твору арыгінальны, хоць ідэя і запазычана.

Здагадваюся! — аўтар хітры, гэта-ж ён склаў «флірт бухгальтароў». Шкода толькі, што аўтар прыдумаў толькі пяць разьдзелаў і ўсяго 49 пытаньняў у іх. Назвы разьдзелаў па сваёй гучнасьці могуць спаборнічаць з назвамі разьдзелаў падручніка Вэйсмана па бухгальтэрыі: 1-ы разьдзел — дакумантацыя. 2-гі—паверка і апрацоўка дакумантаў і справак, 3-ці—сынтэтычны вучот 4-ы — аналітычны вучот і 5 — розныя весткі. Тэрміналёгія строга навуковая. Псуе яе толькі 5-ы разьдзел «Розныя весткі».

Зараз, калі мы ўжо ведаем, для чаго твор складзен і якія ён мае часткі і разьдзелы, — зараз можна распачаць флірт. Мы паспрабуем, карыстаючыся творам, задаваць пытаньні, а т. т. бухгальтары з акруговых устаноў, у якія твор накіраваны, паспрабуйце даць адказы. Не забараняецца ў дачы адказаў прыняць удзел і добраахвотнікам-бухгальтарам і іншых устаноў.

Задаем пытаньні:

«За колькі дзён уключаюцца дакументы ў справу»? (разьдзел 1-ы. пытань. не 3-е). «Ці правільна складаюцца справкі»? (разьдзел 1-ы, пытаньне 4). «Ці вядзецца па справках вучот капілак»? (разьдзел 1-ы, пыт. 6). «Ці рэгіструецца час атрыманьня справак ад кас»? (разьдзел 1-ы, пыт. 12-е). «Як падшываюцца дакументы ў акруговай касе: па касах, ці па днёх? Ці падшыты дакументы за мінулы месяц»? (разьдзел 1-ы, пыт. 15-е). «На які дзень па атрыманьні справак апошнія правяраюцца»? (разьдзел 2-гі, пыт. 1-е). «Колькі асоб і якой кваліфікацыі ўтварае праверку справак»? (разьдзел 2-гі, пыт. 2-е). «Хто правярае дакументы і са справкай па ўкладах — бухгальтэрыя ці наступны кантроль»? (разьдзел 2-гі, пыт. 3-е). «Час запясеньня справак у зводкі: на які дзень па атрыманьні справкі гэта робіцца»? (разьдзел 3-ці, пыт. 1-е). «Ці карыстаюцца акруговыя касы пры складаньні зводкі па V-м разьдзеле высланымі бланкамі зводак»? (разьдзел 3 ці, пыт. 3-е). «Калі робіцца падлік зводак за 15 і 25 дзён і колькі супрацоўнікаў утварае гэты падлік»? (разьдзел 3-ці, пыт. 4-е). «Якія кнігі вядуцца па дапаможнаму вучоту»? (разьдзел 4-ы, пыт. 1-е). «Якія вядуцца картатэкі»? (разьдзел 4-ы, пыт. 2-е). «Апэрацыі ў кнізе запісваюцца за кожны дзень, ці за некалькі дзён»? (разьдзел 4-ы, пыт. 3-е). «Ці акуратна раскладваюцца дакументы па картатэках»? (разьдзел 4-ы, пыт. 4-е). «Ці зроблена расчыстка рахунку пераходных сум»? (разьдзел 4-ы, пыт. 10-е). «Ці ўтвараецца паверка блянак па наяўнасьці і параўнаньне з астачай па кнізе»? (разьдзел 5-ы, пыт. 2-е). «Ці маюцца ў актах інспэктараў па абсьледваньні і рэвізіі кас даныя аб становішчы вучоту блянак суровай справаздачы па гэтых касах»? (разьдзел 5-ы, пыт. 3-е)

Задаць усе пытаньні з твору «Агляд становішча вучоту» не ўдалося — чуецца нястрымны рогат бухгальтароў акруговых устаноў, якія павінны даць адказы на гэтыя запытаньні. Ня чуваць было таксама і гэтых адказаў. Толькі часамі скрозь рогат чуваць: «ну і малайчына наш галоўбух», «зусім ня кепска жыць на сьвеце», «на жаль, мала пытаньняў у гэтым творы», «трэба паслаць удзячны адрас нашаму шаноўнаму галоўбуху за прадастаўленьне нам некалькі прыемных хвілін» і г. д.

Ня шкодна, зусім ня шкодна часамі павесяліцца і павесяліць сваіх падначаленых.

Было-б і нам весела, калі-б ня было так сумна, калі-б усю гэту гісторыю хто-небудзь расказаў у якасьці анэкдота, калі-б гэты твор не пасылалі ў акругі за № 9/24 ад 3-ІІ—30 году, калі-б у адносіне, якою пасылаўся гэты твор, ня было напісана, што: «З прычыны немагчымасьці частага аб'езду акруговых кас бухгальтарамі кіраўніцтва, апошнае прымушана атрымліваць неабходныя весткі ў форме пісьмовага агляду, складзенага акруговымі касамі, якія павінны прысылаць яго кіраўніцтву разам з **месячнай справаздачнасьцю** (да 15-га наступнага месяца)».

Калі-б у гэтым-жа адносьніку ня было напісана таксама, што: «Для ўнікненьня ў гэтых аглядах няяснасьці, непаўнаты і асобнага падыходу кожнай акруговай касы — кіраўніцтва выпрацавала асобную праграму, якая складаецца з адпаведных пытаньняў... аглядпавінен быць складзен у форме адказу на пастаўленыя пытаньні».

і што: «з другога боку, агляд становішча працы па вучоце патрэбен і самім акруговым касам (асабліва загалькам) для таго, каб даць сабе справаздачу ў сапраўдным становішчы вучоту».

Яшчэ горш, што гэты твор падпісан начальнікам кіраўніцтва ашчадными касамі БССР тав. Падольскім і галоўным бухгальтарам Дыбоўскім і асабліва сумна, што на падставе адказаў на гэты твор кіраўніцтва ашчадкасамі разьлічвае «мець магчымасьць своячасова зьнішчыць недахопы, а таксама вывучаць тыя прычыны, якія выклікаюць гэтыя недахопы з мэтаю недапушчэньня іх у далейшым».

Зараз ідзе месячнік агляду рацыяналізатарскай работы ва ўстановах. У гэтым аглядзе — «Агляд» т. т. Падольскага і Дыбоўскага павінен заняць «пачэснае» месца.

Эн. РАН.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА ВЫШЛА З ДРУКУ **МІКУЛІНА.—СПАБОРНІЦТВА МАС.** З прадмовай І. СТАЛІНА. СТАР. 72. ЦАНА 15 кап

Как строить производственный план в колхозах.
Этому вопросу посвящается специальный номер газеты
„ЗА КОЛЛЕКТИВИЗАЦИЮ",
выпускаемый в воскресенье, 2-го марта.
ЦЕНА НОМЕРА—3 коп.
Заказы и деньги срочно направляты Москва, Никольская, 12, издательству „За Коллективизацию".

АД НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ФІНАНСАЎ БССР
1, 2 і 3 сакавіка г. г. у гор. Ленінградзе будзе праведзены
1-шы ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ
3-й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ
У тыражу ўдзельнічаюць усе аблігацыі процантна-выйгрышнага і бяспроцантна-выйгрышнага выпускаў пазыкі. Па кожным выпуску пазыкі тыраж праводзіцца самастойна.
Усяго па абодвух выпусках пазыкі будзе разыграна
90.350 выйгрышаў на суму 18.527.600 руб.
Афіцыйныя табліцы выйгрышаў па кожным выпуску пазыкі асобна будуць надрукаваны ў газ. «Известия ЦИК СССР и ВЦИК».
Наступны другі тыраж выйгрышаў адбудзецца з 3 па 5 мая г. г. у гор. Самаркандзе, а трэці—з 1 па 3 жніўня г. г. у гор. Менску.

Згубленыя і ўкрадзеныя
наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:
Пашпарт Кікоіна Х. Б., выд. Мен. міліцыяй. 246
Асабов. кн. Ручкіна Л. А., выд. Мен. ваенкаматам. 247
Пашпарт Рубенчык Г. М., выд. Мен-міліцыяй. 248
Мэтрыч. вып. Сарокінай Г. В., выд. Вазьнясенскім ЗАГСам. 249
Чл. кн. саюзу транспартнікаў Міхенка І. Н. 250
Вайск. пасьведч. Батвініка Д. М., выд. Мен. ваенкаматам. 251
Чл. біл. саюзу транспартнікаў, канд., карт., выд. Мен. АК КП(б)Б, асабов. пасьведч., выд. праўл. МВБ ч. на імя Золава А. І. 252-254
Чл. біл. саюзу працасьветы Грышчука С. А. 255
Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6/167 Оліга М. Л. 256
Пашпарт Ліўшыца Я. І., выд. Мен. міліцыяй. 257
Асабов. кн. Ліўшыца Я. В., выд. Мен. ваенкаматам. 258
Каапэрац. кн. Маліноўскага С. А., выд. Мен. прытар. спаж. т-вам «Земляроб». 259
Вайск. кн. Батуса Я. А., выд. Мен. ваенкаматам. 260
Парт. біл. № 1297551, выд. Мазырск. АК КП(б)Б, чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6/26416 Фрыдмана А. Ш. 261-262
Вайск. кн. Парашчанка М. В., выд. Бабруйск. ваенкаматам. 263
Лек. кн. Кугеля А. Я., выд. страхкасай пры Мен. аддз. Белсамправсаюзу. 264
Пашпарт Худак І. Н., выд. Мен. міліцыяй. 265
Чл. кн. саюзу саўгандальслужачых Зісман Э. С. 266
Пасьведч. на права нашэньня зброі № 164/66/938 Садоўскага Ц. І., выд. ДПУ Бел. 267
Біржа. нумар Рэйнгольд Х. Ш., выд. Мен., біржа. працы. 268
Матрычн. вып. Рубінштэйн Х. Б., выд. Мен. ЗАГСам 269
Вайск. кн. Грэковіча І. С., выд. Смаляніцк. РВК. 270
Служб. безыменны біл. мясцкому ст. Міхановічы, выд. праўл. Зах. ч. 271
Лек. кн. Баярынай І. Л., выд. Мен. страхкасай. 272
Чл. кн. саюзу будаўнікоў № 6/43692 Ярмаковіча А. І. 273
Мэтрыч. вып. Кулаковіч В. А., выд. Мен. ЗАГСам. 274
Ордэр па памяшканьне, выд. Камгасам на імя Гармаза М. А. 275
Пашпарт Альтшуль Д. М., выд. Мен. міліцыяй. 276
Чл. біл. саюзу мэталістых Ліпніцкага В. Ф. 277
Чл. біл. саюзу нархарч № 4159 Бударовай А. І. 278
Каапэр. кн. № 289 Макоўскага А. Д., выд. Самахвал. спаж. т-вам. 279
Каапэр. кн. № 772 Макоўскай А. С., выд. Самахвал. спаж. т-вам. 280
Вайск. кн. Кацнельсона, выд. Барысаўск. ваенкаматам 281
Пашпарт Дарашэвіч Н. Г., выд. Мен. міліцыяй. 282
Асабов. пасьведч. Рапапорта Н. Х., выд. Мен. міліцыяй. 283
Пашпарт Чартовай Д. Р., выд. Мен. міліцыяй. 284
Камсам. біл. № 88247 Корэуна П. А., выд. Сьвіслаўіцк. РК ЛКСМБ. 285

СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ!
28 ЛЮТАГА а 19 г. 30 м.
Галоўнае кіраўніцтва Ашчадкасамі СССР сумесна з УсеЦСПС і радыё-цэнтрам арганізуюць
РАДЫЁ-СХОД,
прысьвечаны
„МЕСЯЧНІКУ ЗЬБЕРАЖЭНЬНЯЎ"
У радыё-пераклічцы прымаюць удзел усе саюзныя рэспублікі. У пераклічцы выступяць: наркамфін СССР т. Бруханаў, старшыня Цэнтр. Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту пры ЦВК СССР т. Кутузаў, сакратар УсеЦСПС т. Палонскі і інш.
Беларускі радыё-цэнтр будзе трансьляваць праклічку. БССР выступае ў пераклічцы у 19 гадз. 30 мін.
Між асобнымі выступленьнямі—**КАНЦЭРТНЫЯ НУМАРЫ.**
Кіраўніцтва Ашчадкасамі БССР.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Чацьвер, 27 лютага
Ранішнік для вучняў **АВЕЧАЯ КРЫНІЦА** Пачат. роўна а 12 г. дня Білеты ў школах
Увечары спэктакль для саюзу саўгандальслуж. **„ДЖЫМ КУПЕРКОП"** Пачатак роўна а 8 гадз. увечары Білеты ў клюбе саўгандальслуж. імясцком.

Менскі Беларускі Дзяржаўны тэатр
25 і 26 лютага публічны паказальны оперны спэктакль
Беларуск. Дзяржаўн. Музычн. Тэхнікуму
„Цырульнік з Сэвільлі"
опэра ў 4 дзеях. Музыка Росіні.
Пачатак а 8 з пал. гадз. увечары.
Білеты прадаюцца штодзенна ў касе тэатру ад 12 да 2-х і ад 5 да 9 гадз. увечары.

КІНО-ТЭАТР **КУЛЬТУРА** — Аўтэнтычны кіно-дакумент падзей на К.-Уходзяй чыгунцы **Асобная Далёка-Усходняя** фільм у 6 частках. Звыш праграмы кіно-часопіс Савкіно № 5. Пачатак а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.
КІНО **Інтэрнацыянал** — Сатырычная аповесьць у 7 частках **ШКУРНІК** гастролі артыстага Ленінградзкіх тэатраў **Сяргея ВРОНСКАГА** — новы рэпэртуар — Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.
КІНО **Пралетарый** — Мастацкі фільм вытворчасьці „Межрабпом-фільм" **Злачынства Караваева** драма у 6 часьц. Звыш праграмы: кіно-часопіс Савкіно № 5. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.
1-шы дзіцячы кіно-тэатр **„Юны Піянэр"** — **АДЗІНАЦЦАТЫ** мастацкі фільм у 5 ч. Звыш праграмы хроніка САВКІНО № 4. — Штодзенна два сэансы — Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена ад 12 гадз. дня.
КІНО **Спартак** — АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК у удзелам Дугласа Фербэнкса **СЫН ЗОРО** (Працяг карціны „ЗНАК ЗОРО") кіно-роман. у 8 част. Пачат. сэансаў: а 6 30 м. Каса—ад 5 гадз

ВЫШЛІ З ДРУКУ і ПРАДАЮЦЦА:
Пінежскі—ЧЫРВОНАЯ ГВАРДЫЯ— нарыс гісторыі пінерскай Чырвонай гвардыі 1917 г. Стар. 142. Цана 40 кап.
Касьцерын—ЛЁТНІК— Стар. 50. Цана 12 кап.
Аляксеёў і Хорыкаў— РАСКАЗЫ БЫВАЛАГА КУЛЯМЁТНІКА Стар. 78. Цана 20 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках Таварыства. Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяноце па тэл. 7-81

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяноце па тэл. 2-49

БЕЛДЗЯРЖКІНО АПАВЯШЧАЕ
ШЫРОКІ КОНКУРС
на напісаньне сцэнарыяў на тэму
АБ **ПЯЦІГАДОВЫМ ПЛЯНЕ БССР** ДЛЯ:
1. Мастацкае поўнамэтражнае фільмы,
2. Поўнамэтражнае культурфільмы і
3. Кароткамэтражнае культурфільмы.
УСТАНОЎКА: Сцэнары павінен адбіць, як Беларусь в краіны сацыяльнага і нацыянальна-культурнага ўціску, краіны дробнае саматужнае прамысловасьці і старэйшае індывідуальнае сялянскае гаспадаркі, праз выкананьне генэральнае лініі партыі на індустрыялізацыю і калектывізацыю, канкрэтным вылуўленьнем якой зьяўляецца пяцёхгодка. Паказаць той энтузіязм і ўздым шырокіх колаў працоўных, што знайшлі сваё выяўленьне ў сацыялістычным спаборніцтве, у масавым руху за калектывізацыю на вёсцы, у ліквідацыі кулацтва, як класы,—дапамагаюць выкананьню пяцёхгодкі. Падкрэсліць тыя цяжкасьці і перашкоды, што сустракаюцца пры рэалізацыі пяцігодкі.
1. Сцэнары мастацкае і поўнамэтражнае культурфільмы павінны быць зладзены да 1-га чэрвеня г. г. 2. Сцэнары кароткамэтражнай культурфільмы да 1-га мая г. г. 3. Да сцэнарыя прыладжыць запачатаны канварт, у ніім вызначаецца як умоўнае, так і сапраўднае прозьвішча аўтара і адрас.
НА СЦЭНАРЫ ВЫЗНАЧАЕЦЦА ТОЛЬКІ ЎМОЎНАЕ ПРОЗЬВІШЧА.
Для сцэнарыяў Белдзяржкіно вызначае
КАСТУПНЫЯ ПРЭМІІ:

Для сцэнарыя поўнамэтражнае мастацкае карціны	Для сцэнарыя поўнамэтражнае культурфільмы	Для сцэнарыя кароткамэтражнае культурфільмы
3 ПРЭМІІ	2 ПРЭМІІ	2 ПРЭМІІ
1 прэмія . . 1000 р.	1-ая прэмія . . 500 р.	1-ая прэмія . . 300 р.
2 „ . . 750 р.	2-ая „ . . 300 р.	2-ая „ . . 200 р.
3 „ . . 500 р.		

Аўтарам прынятых сцэнарыяў, апрача прэміі, будзе выдадзена аплата за сцэнары мастацкае карціны—1.000 руб., за сцэнары поўнамэтражнае культурфільмы—500 руб. і за сцэнары кароткамэтражнае культурфільмы—300 руб.
Апрача гэтага аўтар сцэнарыя атрымлівае з пракату карціны поўны проц. гаданару, згодна існуючаму аўтарскаму праву.
АБ СКЛАДЗЕ ЖУРЫ БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЕНА ДАДАТКОВА.
СЦЭНАРЫІ ПРЫСЫЛАЦЬ:
Менск, Рэвалюцыйная № 4, БЕЛДЗЯРЖКІНО.

Менск, Галоўлітбел № 337.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.